ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 27 (5033) 12 ліпеня 2019 г.

ISSN 0024-4686

16 +

Міхась Мушынскі. Пакліканне
стар. 5

Насустрач марам, наўздагон міражам
стар. 6

Песні, вёска, павукі?
стар. 10

У краіне песняроў

Сёлета «Славянскі базар у Віцебску», нягледзячы на халоднае надвор'е, пачаўся з узняцця сцяга фестывалю каля летняга Амфтэатра. Учора фестываль афіцыйна адкрыўся для ўдзельнікаў і гасцей горада на Дзвіне. Як і ў мінулыя гады, арганізатары паспрабавалі пабудаваць праграму такім чынам, каб наведвальнікі змаглі паспець паглядзець усё.

Першымі валадарыць тут сталі дзеці, юныя вакалісты і ўдзельнікі конкурсу. Выступіў Прэзідэнцкі аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкіна. На працягу фестывалю госці змогуць паслухаць канцэрт салісткі Латвійскай нацыянальнай оперы Ілоны Багелэ, пазнаёміцца з праграмай Дзяржаўнага омскага рускага народнага хору і святочнай праграмай Уладзіміра Грышко і «*GRISHKO ORCHESTRA BAND*» — «Ты — мая мелодыя», прысвечаную Мусліму Магамаеву. Таксама ў межах фестывалю адбудзецца гала-канцэрт майстроў Ізраіля і выступленне музычнага гурта «Сурганава і аркестр». Асноўную інтрыгу надасць конкурс маладых выканаўцаў эстраднай песні.

Першыя дні фестывалю традыцыйна прысвечаны супрацоўніцтву ў межах Саюзнай дзяржавы. І беларускае слова тут важкае: асновай канцэрта «Саюзная дзяржава запрашае», які традыцыйна вянчае праграму Дня сяброўства, сёлета будзе святкаванне 50-годдзя творчай дзейнасці ансамбля «Песняры».

Працяг на стар. 3 ►

Фота belta.

Папараць з вянкоў жаданняў

Пра сімвалічны сэнс кветак Беларусі даведаліся госці Александрыі

Напоўненае міфамі і паданнямі старажытнае свята Купалле — адзін з брэндаў айчыннай культуры. Самай вялікай пляцоўкай, дзе Купалле праходзіць з міжнародным размахам, у сучаснай Беларусі стаў аграгарадок Александрыя. У Шклоўскі раён Магілёўскай вобласці з'язджаюцца тысячы гасцей, каб у адну з самых кароткіх летніх начэй атрымаць асалоду ад яркага дзейства на маляўнічым беразе «ракі сяброўства» — Дняпра.

Дзясяты фестываль «Александрыя збірае сяброў» наведалі больш чым дзве тысячы артыстаў і майстроў з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Латвіі і Эстоніі і 100 тысяч гасцей. Па традыцыі асновай фестывалю стала народная творчасць, якая была прадстаўлена ва ўсім багацці, шматкаляровасці на «Александрыйскім кірмашы». Асноўная тэма свята — Год малой радзімы, таму прадстаўнікі розных куткоў Беларусі праз традыцыйныя рамёствы, песні, танцы маглі расказаць пра асаблівасці свайго рэгіёна, падкрэсліць яго ўнікальнасць.

Працяг на стар. 4 ►

Фота Вікторыі Аскера.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 19027

акцэнты тыдня

Незалежнасць. Памяць пра тых, хто змагаўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — частка нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Гэта Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў на парадзе ў гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дня Незалежнасці. Беларусь урачыста адзначае галоўнае дзяржаўнае свята — Дзень Незалежнасці. Гэты дзень, адзначыў Прэзідэнт, у далёкім 1944 годзе вярнуў мір на змучаную фашысцкай акупацыяй зямлю, паказаў нязломную сілу савецкага народа, беларусаў, якія стаялі насмерць за сваю свабоду.

Еднасць. Свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») за 10 гадоў існавання стала яркім сімвалам братэрскай дружбы народаў Беларусі, Расіі і Украіны, падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі на свяце ў Александрыі. «Тры нацыі пераплецены гістарычнымі, роднаснымі, духоўнымі каранямі, як тры магутныя дубы на беразе паўнаводнага і шчодрага Дняпра», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Для любога чалавека вельмі важна не страчваць сувязь са сваімі роднымі мясцінамі і людзьмі, якія там жывуць. «Калі ён не страчвае гэтыя пачуцці, значыць, ён чалавек. Калі ён іх страціў і ўзнёсся вельмі высока, забыўшыся пра людзей, ён перастае быць чалавекам», — пераканаы Прэзідэнт.

Страта. Прэзідэнт Беларусі накіраваў спачуванне родным і блізкім народнага мастака Беларусі Віктара Грамыкі. «Прыміце мае глыбокія спачуванні ў сувязі з адыходам з жыцця выдатнага майстра сучаснасці, — гаворыцца ў спачуванні. — З жыцця пайшоў чалавек вялікага таленту, чыёй творчасцю па праве ганарыцца наша краіна. Работы Віктара Аляксандравіча, якія ўяўляюць сабой узоры высокага мастацтва, прызнаны не толькі ў Беларусі, але і за мяжой». Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Віктар Грамыка выхаваў некалькі пакаленняў маладых мастакоў і стаў прыкладам самаадданага служэння Радзіме.

Хатынь. Выстаўка «Леанід Левін. Філасофія творчасці» адкрылася ў фотадакументальнай экспазіцыі дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Наведвальнікам прапануюць частку творчай спадчыны архітэктара — работы перыяду з канца 1960-х да 2014 года, макеты помнікаў, асабістыя рэчы. Побач з кожным экспанатам — планшэты, дзе можна прачытаць выказванні Леаніда Левіна наконт сваіх работ. Выстаўка падрыхтавана супрацоўнікамі «Хатыні» сумесна з творчай майстэрняй Леаніда Левіна і яго сям'ёй і прымеркавана да 50-годдзя з дня адкрыцця мемарыяльнага комплексу.

Праект. Маштабны выставачны праект «Вайна і Мір Вадзіма Сідура» прапануе Нацыянальны гістарычны музей. Вадзім Сідур — савецкі мастак і скульптар, авангардыст, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. За сваё жыццё стварыў больш чым 500 скульптур, 2 тыс. графічных работ, а таксама зборнік вершаў, кнігу авангарднай прозы, кінафільм. Помнікі яго аўтарства ўстаноўлены ў Германіі, ЗША, Расіі. У экспазіцыю ўвайшло каля 50 работ Вадзіма Сідура з фондаў дзяржаўнай установы культуры горада Масквы «Музейна-выставачнае аб'яднанне "Манеж"», а таксама творы з прыватных калекцый.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

супрацоўніцтва

Праекты перспектыў

Працягваецца работа над рэалізацыяй «Праекта перакладу і публікацыі класічных літаратурных твораў Кітая і Беларусі». Пра гэта ішла размова на пасяджэнні рабочай кардынацыйнай групы па беларуска-кітайскім супрацоўніцтве, якая прайшла ў Міністэрстве інфармацыі.

Удзел у пасяджэнні ўзялі міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч, намеснік міністра Ігар Бузоўскі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел Сухарукаў, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Святлана Воцінава, адказны сакратар часопіса «Полымя» Юлія Алейчанка, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак, кансультант Міністэрства інфармацыі па міжнародных пытаннях Андрэй Чэрнікаў. Размова ішла пра рэалізацыю праграмы перакладу класічнай літаратуры Кітая і Беларусі. Было адзначана, што ў Беларусі шмат робіцца па публікацыі перакладаў класічнай і сучаснай кітайскай паэзіі і прозы на беларускую мову. Пачынаючы з 2012 года, выйшла каля 20 мастацкіх кніг кітайскіх паэтаў і празаікаў. Анталагічныя зборнікі «Пад крыламі Дракона», «Пялёскі лотаса і хрызантэмы», вялікі зборнік паэзіі Ай Ціна «Гімн святлу» нарадзіліся дзякуючы руплівасці перакладчыка Міколы Мятліцкага. У Выдавецкім доме «Звязда» была распачатая серыя «Светлыя знакі: Паэты Кітая» (цяпер яна выходзіць у выдавецтве «Мастацкая літаратура»), у якой на сёння выйшла 13 паэтычных зборнікаў тварцоў Кітая.

Шмат публікацый здзейснена і ў літаратурна-мастацкіх выданнях: у газеце «Літаратура і мастацтва», часопісах «Маладосць», «Полымя», «Нёман». Актыўна працуе на ніве беларуска-кітайскага літаратурнага ўзаемадзеяння і часопіс «Беларусь».

Важна, падкрэслілі ўдзельнікі пасяджэння, каб і беларуская літаратура была годна прадстаўлена ў Кітаі. Дарэчы, першыя крокі ў гэтым плане ўжо зроблены. З'явілася грунтоўная «беларуская падборка» ў кітайскім часопісе «Захад». Шэраг літаратурна-крытычных, гісторыка-літаратурных публікацый, прысвечаных беларускаму прыгожаму пісьменству, з'явілася ў часопісе «Руская літаратура і мастацтва» (выданне асвятляе прастору ўсіх постсавецкіх нацыянальных літаратур). Кітайскаму боку перададзена і анталогія сучаснай беларускай дзіцячай літаратуры для перакладу на кітайскую мову.

Зараз у Міністэрстве інфармацыі краіны ідзе падрыхтоўка да дастойнага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь на традыцыйнай кніжнай выстаўцы ў Пекіне, якая адбудзецца ў жніўні 2019 года.

Сяргей ШЫЧКО

Стасункі праз мастацтва слова

Развіццё беларуска-азербайджанскіх літаратурных сувязяў, несумненна, залежыць ад яркіх, харызматычных асоб, каму цікавая Беларусь, хто ўважлівы ў Азербайджане — да культуры Беларусі, а ў Беларусі — да культуры, асветніцтва ў Азербайджане.

Адна з такіх асоб — пісьменнік Камран Назірлі, які ўжо неаднойчы наведваўся ў Беларусь. Ён з'яўляецца перакладчыкам беларускай прозы на азербайджанскую мову. Калегі з Мінска высока адзначылі працу празаіка і перакладчыка, прыняўшы Камрана Назірлі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі.

Падчас чарговай вандроўкі ў нашу краіну Камран Назірлі наведаў Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, перадаў для Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі падборку азербайджанскіх газет, часопісаў, дзе апошнім часам надрукаваны творы нашых пісьменнікаў: напрыклад, Юліі Алейчанкі, а таксама ўдзельнікаў міжнародных літаратурных сустрэч у Мінску паэта з Чачэнскай Рэспублікі Адама Ахматукаева і празаіка з Малдовы Юрыя Іванова. Прывёз у Беларусь Камран Назірлі і газеты з публікацыямі пра беларускага мастака азербайджанскага паходжання Каміля Камала, які жыве і працуе ў Мінску. 2019 год у Азербайджане лічыцца Годам Насімі — пачынальніка азербайджанскай паэзіі, мастака слова XIV — пачатку XV стагоддзяў. Камран Назірлі падрыхтаваў у сувязі з гэтым лекцыі-прэзентацыі, прысвечаныя класіку, адна з якіх прачытана ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Карскага.

У сваю чаргу К. Назірлі перадалі альманах «Далягляды» з публікацыямі вершаў азербайджанскіх паэтаў у перакладзе на беларускую мову. Удзел у сустрэчы з азербайджанскім пісьменнікам узялі міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч, намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі празаік Анатоль Матвіенка.

Сяргей ШЫЧКО

Беларуска-туркменскія ініцыятывы

У Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь прайшла рабочая сустрэча з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Туркменістана ў Рэспубліцы Беларусь Назаргулы Шагулыевым.

Зараз у Туркменістане ідзе падрыхтоўка да Першага Каспійскага эканамічнага форуму. Ён пройдзе 11—12 жніўня 2019 г. у горадзе Туркменбашы ў нацыянальнай турыстычнай зоне «Аваза». Туркменскі дыпламат выказаў спадзяванне, што падзея будзе заўважаная і ў Беларусі, запрасіў да ўдзелу ў форуме кіраўнікоў масмедыя Беларусі. Таксама ішла размова пра болей шырокае медыйнае двухбаковае супрацоўніцтва, пра пашырэнне беларускага кантэнту ў туркменскіх СМІ, а туркменскага — у беларускіх.

У час сустрэчы згадваліся імёны літаратараў Туркменістана, якія апошнім часам наведалі Беларусь: празаікаў Бягуль Анабаевай, Агагельды Аланазарава, паэтэсы Героя Туркменістана Газель Шагулыевай. Дарэчы, іх творы апошнім часам надрукаваны ў перакладзе на беларускую мову. А таксама ў беларускіх літаратурна-мастацкіх масмедыя змешчаны вершы і апавяданні Аннамухамеда Кіршэна, Касыма Нурбадава, Камека Куліева, Максата Бяшымава і іншых літаратараў Каракумскага краю.

Сяргей ШЫЧКО

Год малой радзімы

Прыцягненне Случчыны

Выдавецтва «Беларусь» у знак таго, што ў нашай краіне абвешчаны Год малой радзімы, адкрыла сімпатычную і вельмі красамоўную ўжо па самой назве кніжную серыю — «Падарожжа па родным краі».

З навінак у гэтым праекце — кніга лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Алеся Марціновіча «Случчына. Старонка міла і багата».

З прадмовы пісьменніка да кнігі-падарожжа: «Бадай, кожнаму вядома выслоўе: "У Слуцку — усё па-людску". Па-людску — значыць, жывуць тамашнія людзі годна, сумленна, славяцца сваімі добрымі справамі. Дарэчы, так яны жылі і ва ўсе часы, пачынаючы з самай сівой даўніны. Працавалі, не ведаючы стомы, таму мелі не толькі хлеб, а і да хлеба. Калі ж нападалі на іх заваёўнікі, не задумваючыся, браліся за зброю. Ведалі: калі сам сябе не абароніш, ніхто гэтага за цябе не зробіць. Мужна ваявалі не толькі мужчыны. Не чужой была ратная слава і жанчынам. Невыпадкова сёння княгіня Настасся Слуцкая — увасабленне мужнасці і гераізму ўсяго беларускага народа…»

Назву для кнігі Алесю Марціновічу падказалі радкі з неўміручай коласаўскай «Новай зямлі»:

Прад імі Случчына ляжала,
Старонка міла і багата.

Упрыгожванне любой старонкі — людзі, ураджэнцы краю. Праз іх лёсы найперш і стараецца паказаць Случчыну Алесь Марціновіч, які, дарэчы, і нарадзіўся ў гэтай прыгожай старонцы. У кнізе мы знойдзем падрабязны расповед пра князёў Алелькавічаў — Аляксандра, Сямёна, Міхаіла, пра згаданую ўжо Настассю Слуцкую. «Дзякуючы мастацкаму фільму "Настасся Слуцкая", знятаму ў 2003 годзе на кінастудыі "Беларусьфільм" са Святланай Зелянкоўскай у галоўнай ролі, пра гэтую слуцкую княгіню ведаюць многія. З падачы некаторых гісторыкаў і пісьменнікаў яе нават называюць беларускай Амазонкай. Сапраўды, пэўнае падабенства ёсць. Таксама была ваяўнічай і мужнай. Ды такой стала па неабходнасці. Моцна кахала свайго мужа Сямёна Міхайлавіча. Супраць татараў часам выступала разам з ім. Але нярэдка і сама вяла ў бой случакоў, калі муж знаходзіўся ў чарговым баявым паходзе. Тым больш пасля таго, як яго не стала...» — піша А. Марціновіч.

Расказвае пісьменнік і пра Хадкевічаў, Радзівілаў у судакрананні з лёсам Слуцка, Случчыны, стварае рэльефныя біяграфічныя партрэты славутых гістарычных персанажаў, робіць цікавыя высновы, зазіраючы ў абставіны іх жыцця. Часам здаецца нават, што кожны з раздзелаў «Случчыны…» мог бы стаць асобнай кнігай.

У раздзеле «Птушка ляцела — і да Кітая даляцела» — пра Кандрата Карсаліна, мастака, які жыў і працаваў у Паднябеснай у складзе Расійскай духоўнай місіі — прадстаўніцтве Рускай праваслаўнай царквы і Расійскай імперыі ў Пекіне. Случчанін пражыў у Кітаі каля трох гадоў.

Герб Слуцка.

Пра Случчыну напісана досыць шмат. І гэтае ўнікальнае «культурнае гняздо», пагадзіцеся, заслугоўвае такой увагі. Праца «Случчына. Старонка міла і багата» — добры ўнёсак у агульную слуцкую бібліятэку. Выданне краязнаўчай кнігі Алеся Марціновіча пра Случчыну — яшчэ і добры напамін кожнаму пісьменніку, што кожны з іх у стане зрабіць такі падарунак роднай старонцы.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***17 ліпеня** — на сустрэчу старшыні абласнога аддзялення СПБ Алеся Казекі з землякамі ў Чачэвіцкую сельскую бібліятэку Быхаўскага раёна (12.00).*

У краіне песняроў

У музеі-сядзібе «Здраўнёва» пройдзе медыясесія «Саюзная дзяржава: як перадаць культурны код моладзі». Дыскусія будзе прысвечана захаванню культурнай спадчыны Ільі Рэпіна, 175 гадоў з дня нараджэння якога адзначаюць сёлета.

— Мы запланавалі некалькі рознабаковых мерапрыемстваў. Напрыклад, у Мастацкім музеі запланавана некалькі выставак, — адзначае старшыня Дэпартамента сацыяльнай палітыкі і інфармацыйнага забеспячэння Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы Маргарыта Леўчанка. — Пачынае работу выстаўка «Растоўская фініфць», якую адкрые дэфіле мадэляў. У Віцебску будзе прадстаўлена і выстаўка аднаго дня — рэплікі Вялікай імператарскай кароны. Плануецца экспазіцыя, прысвечаная вобразу Аляксандра Неўскага ў мастацкай творчасці.

Учора ў фестывальным Віцебску стартаваў «Лялечны квартал». Да 16 ліпеня на сцэне віцебскіх тэатраў найлепшыя спектаклі прэзентуюць лялечныя тэатры з Беларусі, Расіі і Украіны. Апроч таго, «Лялечны квартал» прапануе чатыры паўнавартасныя вулічныя спектаклі, якія адбудуцца каля Цэнтра сучаснага мастацтва на вуліцы Талстога, і шматлікія канцэртныя ды забаўляльныя праграмы і перфомансы. Адкрыў праграму спектакль віцебскіх лялечнікаў «Брэменскія музыкі». Гаспадары сцэны падораць віцяблянам і гасцям горада спектакль-імправізацыю «Казкі пра казку», прэм'ера якога адбылася сёлета, і прэм'ерны спектакль новага сезона «Мастак. Вяртанне ў Віцебск», прысвечаны Віцебску і яго знакамітаму ўраджэнцу Марку Шагалу.

Акрамя таго, фестываль традыцыйна парадуе наведвальнікаў разгорнутым у сэрцы Віцебска «Горадам майстроў».

Вікторыя АСКЕРА

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

прэм'ера

Дзе тваё сэрца?..

Жыццё рэпатрыянтаў як сведчанне прывязанасці да радзімы

У які б прыгожы край ні закінуў чалавека лёс, у яго сэрцы будзе жыць вобраз радзімы і імкненне вярнуцца дадому — пра гэта распавядае гістарычны фільм «Жанін» Уладзіміра Бокуна. Гісторыі «дзяцей Францыі» — рэпатрыянтаў, якія апынуліся ў Беларусі, ілюструюць тэму прывязанасці чалавека да яго каранёў. Паразважаць пра гэта нам прапануюць 13 чэрвеня, калі фільм будзе паказаны на тэлеканале АНТ.

Галоўная гераіня карціны — Жанін Крынцэвіч. Падчас Другой сусветнай вайны бацькам Жанін давялося ўсёй сям'ёй пакінуць Радзіму і пачаць новае жыццё ў іншай краіне. Улада СССР абяцала рэпатрыянтам з Францыі працу, бясплатную адукацыю, магчымасць у любы час вярнуцца дадому. Такім чынам Жанін стала жыхаркай Беларусі.

Дакладная колькасць рэпатрыянтаў з Францыі, што жывуць у Беларусі, невядомая. Але «дзяцей Францыі» адно аб'ядноўвае дакладна — любоў да сваёй Радзімы. Пра гэта сведчыць гісторыя, якая падштурхнула да работы над фільмам.

Аднойчы ў Пасольства Францыі ў Беларусі прыйшоў ліст, у якім жыхар Віцебска Іван Паўлавіч папрасіў даслаць яму французскі сцяг, якім, па жаданні мужчыны, павінна быць накрытая труна ў дзень яго пахавання. Пасольства зацікавілася гісторыяй аўтара ліста, разам з тым з'явілася жаданне знайсці іншых рэпатрыянтаў, даведацца, як склаўся іх лёс у Беларусі. Напрыклад, выкладчык французскай мовы Сцяпан Батура, не забываючы пра сваё паходжанне, паспрыяў і развіццю беларускай культуры: перакладаў Быкава і Караткевіча. Менавіта да яго звярнуліся, калі трэба было перакласці на французскую Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Студыя гістарычных фільмаў «Майстэрня Уладзіміра Бокуна» звяртае ўвагу на складаныя лёсы людзей, у тым ліку асоб, якія зрабілі значны ўнёсак у айчынную і сусветную культуру і навуку.

Юлія САКОВІЧ

па-за сезонам

ТЭАТР У ТЭСТАВЫМ РЭЖЫМЕ:

ад класічных тэкстаў да інтэрактыўных фарматаў

Лета — час тэатральнага зацішша. Толькі не ў гэтым годзе. Напрыканцы чэрвеня распачала работу летняя рэзідэнцыя *Laba-spase*, асноўны клопат якой сёлета — розныя тэатральные формы.

У культурным хабе ОК16 на працягу некалькіх тыдняў інтэнсіўна працуюць спецыяльна адабраныя каманды. У незвычайнай для тэатра заводскай прасторы маладыя рэжысёры, якія дасылалі заяўкі з ідэямі пастановак, паказваюць фрагменты з іх. У сваіх творах аўтары звяртаюцца да фальклору, класікі, сучаснай харэаграфіі, спрабуюць інтэрактыўныя фарматы. Такім чынам арганізатары імкнуцца дапамагчы маладым творцам, якія гараць уласнымі ідэямі. Для гэтага ім прапануюць і экспертныя кансультацыі, і пляцоўкі для рэалізацыі задум.

Праект *Laba-spase* стварае новыя магчымасці і для гледачоў: адкрыць для сябе тэатральнае мастацтва, а захапіцца нечаканымі формамі. Галоўнае — пасля паказаў прадугледжана публічнае абмеркаванне спектакляў. Чым не варыянт развіць свае крытычныя здольнасці і эрудыцыю?

Трапіць на любую з пастановак летняй рэзідэнцыі можна па спецыяльным абанеменце. Ён дае магчымасць наведаць усе спектаклі ў межах адной сесіі. Першая з іх — 12 ліпеня. На другую *Laba-spase* запросіць з 12 да 21 жніўня.

Паліна ЗАБЕЛА

на развітанне

Філасофія Віктара Грамыкі

Народны мастак Беларусі пайшоў на 97-м годзе жыцця. Сведка і ўдзельнік самых драматычных падзей мінулага стагоддзя, казаў пра яго праз свае творы прама, лічыў, што за рэалізмам — праўда жыцця, якая пранікае нават у метафары і алегарычныя сюжэты. Асабліва вылучаюцца ў яго творчасці работы, прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай: Віктар Грамыка іх пісаў як сведка, адсюль пранізлівасць і экспрэсія, якая ўзрушвае нават тых, хто належыць да іншых пакаленняў. Яго змаганне за праўду было рашучым і актыўным тады, калі трэба было змагацца з ворагамі — у падполлі і партызанах. Яго змаганне за праўду ў мастацтве было ціхае — з пазіцыі творцы, які прапаноўвае сваё бачанне свету. Ураджэнец Магілёўшчыны, ён любіў пісаць пейзажы, якія зачароўвалі каларыстыкай і неслі радасць, — у гэтым Грамыка быў асабліва чулы, магчыма, таму, што выпала змагацца супраць вынішчэння гармоніі. Нават простым сюжэтам надаваў філасофскі сэнс. І гэта выявілася не толькі ў выяўленчым мастацтве. Віктар Грамыка праявіў сябе як і літаратар, у 2010 годзе быў адзначаны Міжнароднай прэміяй імя М. Шолахава.

Узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі за ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне і за заслугі ў развіцці выяўленчага мастацтва (3 ордэны, 20 медалёў).

ЛіМ КАЛЯНДАР

13 ліпеня — 130 гадоў з дня нараджэння Сяргея Нікалаева (1889—1973), расійскага і беларускага мастака тэатра, заслужанага артыста Расіі, народнага мастака БССР.

13 ліпеня 80 гадоў спаўняецца Дзіяне Стэльмах, тэатразнаўцы.

13 ліпеня 70-гадовы юбілей святкуе Анатоль Концуба, майстар дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва.

15 ліпеня — 115 гадоў з дня нараджэння Веры Гаўрылюк (1904—1986), майстра мастацкага саломапляцення, ініцыятара адраджэння традыцый мастацкай саломкі на Беларусі.

15 ліпеня — 110 гадоў з дня нараджэння Моты Дзегцяра (1909—1939), празаіка.

15 ліпеня — 80 гадоў з дня нараджэння Васіля Макарэвіча (1939—2017), паэта, журналіста.

15 ліпеня — 80 гадоў з дня нараджэння Пятра Навасада (1939—1994), спевака, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь.

16 ліпеня — 100 гадоў з дня нараджэння Паўла Ахрыменкі (1919—1997), беларускага і ўкраінскага крытыка, літаратуразнаўца, фалькларыста.

17 ліпеня 60-годдзе адзначае Барыс Пятровіч (сапр. Сачанка), празаік.

17 ліпеня 60 гадоў спаўняецца Вользе Русілцы, паэтэсе, літаратуразнаўцы.

18 ліпеня — 115 гадоў з дня нараджэння Алены Радзялоўскай (1904—1971), народнай артысткі БССР.

18 ліпеня — 85 гадоў з дня нараджэння Алега Арлова (1934—1995), мастака, педагога.

18 ліпеня 80-гадовы юбілей святкуе Генадзь Шутаў, графік, акварэліст, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

18 ліпеня 75-годдзе адзначае Эміль Наско, кампазітар.

18 ліпеня — 35 гадоў таму (1984) створаны Дзяржаўны маладзёжны тэатр Рэспублікі Беларусь.

18 ліпеня 60 гадоў спаўняецца Галіне Мароз, паэтэсе.

19 ліпеня — 150 гадоў з дня нараджэння Лявона Вітана-Дубейкаўскага (Дубяйкоўскага) (1869—1940), паэта, архітэктара.

люстэрка тыдня

Дэлегацыя Пасольства КНР у Беларусі на чале з саветнікам Ло Чжаньхуэем наведала Нацыянальную кінастудыю «Беларусьфільм» і разам з яе генеральным дырэктарам Уладзімірам Карачэўскім абмеркавала магчымасць удзелу беларускіх карцін у кітайскіх кінафестывалях, паведаміла БелТА. Паводле Уладзіміра Карачэўскага, разам з партнёрам кінастудыі — кампаніяй «Эмі Інтэрнэшнл» было арганізавана правядзенне Дзён кітайскага кіно ў Мінску і наладжаны стасункі з многімі кітайскімі кампаніямі і арганізацыямі кінематографа. Цяпер ужо з дзвюма кампаніямі ідзе ўзгадненне здымак сумеснага фільма, таксама абмяркоўваецца ўдзел у Міжнародным кінафестывалі вострава Хайнань і Шанхайскім міжнародным кінафестывалі. Гасцей азнаёмілі са здымачнымі павільёнамі, распавялі пра багатую гісторыю кінастудыі і прэзентавалі трэйлер нацыянальнага праекта «Купала».

Чацвёртае свята дружбы Італіі і Беларусі правядуць заўтра у Мінску, паведамляе Пасольства Італіі ў Беларусі. Мяркуецца шырока прадставіць італьянскія традыцыі, культуру, умацаваць дружбу з беларускім народам. «Ёсць спадзеў паўтарыць мінулагодні поспех, калі больш як 20 тыс. чалавек наведалі наша свята», — адзначаюць у дыпмісіі. Галоўнымі гасцямі фестывалю стануць музычная група *Tributo Italiano* з хітамі італьянскай музыкі, дуэт мімаў-акрабатаў — удзельнікі шматлікіх праектаў на італьянскім тэлебачанні, піцаёла-акрабаты, якія выконваюць арыгінальныя нумары на мяжы спорту і кулінарнага майстэрства. Фальклорныя традыцыі Італіі на свяце прадставяць сцяганосцы з Сант-Эльпідыа-а-Марэ. Узбагаціць афішу падзей выстаўка рэтраматацыклаў, выступленні хору імя Цітовіча, салістаў-віртуозаў Вялікага тэатра Беларусі.

У Брэсцкім акадэмічным тэатры драмы ў гонар святкавання 75-й гадавіны вызвалення абласнога цэнтра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 28 ліпеня наладзяць XVII Берасцейскі канцэрт-баль. Патанчыць на балі ў суправаджэнні гарадскога духавога аркестра пад упраўленнем Валерыя Коваля госці змогуць у другім аддзяленні. А ў першым на сцэну БАТД выйдзе гітарыст-віртуоз з Італіі Том Сінатра. Выступленне аднаго з самых вядомых гітарыстаў свету разлічана прыкладна на дзве гадзіны. «Гэта вялікая падзея для нас: упершыню на Берасцейскім балі выступіць сусветная зорка. У праграме магчымы сюрпрызы», — адзначаюць арганізатары.

Знішчаны падчас вывяржэння вулкана Везувій старажытнарымскі горад Пампеі знаходзіцца перад сур'ёзнай пагрозай. Зыходзіць гэта небяспека з часоў Другой сусветнай вайны. Да такога меркавання, паводле БелТА, прыйшлі аўтары журналісцкага расследавання рэдакцыі газеты *Il Fatto Quotidiano*, якая ўпершыню апублікавала матэрыялы аб бамбардзіроўцы сіламі антыгітлераўскай кааліцыі 24 жніўня 1943 года. Тады на зону горада-музея пад адкрытым небам, сістэмныя раскопкі якога ідуць з XVIII стагоддзя, былі скінуты 165 бомбаў. Як вынікае з дакументаў, існуе карта з больш або менш пацверджаным месцазнаходжаннем бомбаў, некаторыя з якіх не разарваліся. Частка з іх знаходзіцца ў зонах, дзе працягваюцца раскопкі «мёртвага горада». Па сведчанні археолагаў, праца ідзе з максімальнай засцярогай і ў прысутнасці сапёраў.

Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ

Калектыў Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ выказвае шчырыя спачуванні дзіцячай пісьменніцы Ганне Скаржынскай-Савіцкай у сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю бацькі.

Народнае свята для народнага паэта

Цьмяная фігура, абапіраючыся на палку, назірае за паркам. Твар аднаасова ўсмешлівы і засяроджаны — выраз яго залежыць ад настрою таго, хто ў яго ўглядаецца. Янка Купала стаіць сярод дрэў у самым цэнтры Мінску, у гэты дзень, як і шмат гадоў дагэтуль, яму зноў прыносілі кветкі.

Каля зялёных сцен аднаго з найважнейшых літаратурных музеяў Беларусі паступова збіраліся людзі. Пісьменнікі, выдаўцы, акцёры, публіцысты — літаратурная інтэлігенцыя Беларусі — адзін за другім ускладаюць белыя ружы да бронзавай постаці чалавека, які з'яўляецца адным са слупоў беларускай літаратуры. Тыя, з чыіх рук ужо зніклі белыя кветкі, паважліва адыходзілі і разбіваліся на групы. «Я ў дзяцінстве ведаў сучасную рускую, беларускую, польскую і ўкраінскую літаратуру. А сёння ў моладзі проста няма такой патрэбы, яны могуць зазірнуць у Вікіпедыю, каб уся інфармацыя праз хвіліну выветрылася», — абмяркоўваюць два чалавекі, назіраючы за цырымоніяй. Між тым сярод тых, хто прыйшоў ушанаваць памяць паэта, ёсць і дзеці.

Урачыстая частка шмат часу не заняла. Акцёрка Купалаўскага тэатра Марыя Захарэвіч прадэкламавала радкі паэта. Літаральна праз дваццаць хвілін пляцоўка каля помніка Янкі Купалы апусцела, і пра дзень нараджэння класіка нагадвалі толькі белыя кветкі. Асноўнае святкаванне адбываецца не тут, пад бронзавым позіркам, а там, дзе заўсёды застаецца душа паэта, — у месцы яго нараджэння, у Вязынцы.

Літаратурную дэлегацыю ў Вязынцы сустракаюць гукі музыкі і традыцыйныя хлеб-соль. Пасля прывітальных спеваў гаспадары маладзечанскай зямлі, фальклорны гурт «Маркаўчанка», жадаюць гасцям натхнення, каб у іх тут, у Вязынцы, нарадзіліся новыя радкі новых твораў. «Ужо нарадзіліся, па дарозе», — перамаўляюцца некалькі чалавек у натоўпе. Каля бюста пісьменніка — зноў ускладанне белых ружаў і першы паэтычны выступ: Міхась Башлакоў палымяна заклікаў сапраўдных паэтаў да адказнасці за слова.

Свята народнага паэта мусіць быць не толькі паэтычным, але і народным. Таму ўздоўж дарожкі на тэрыторыі музея раскінуліся палаткі з ежай і рамёствамі, а вакол іх блукаюць, азіраючыся, самыя розныя людзі. Ці з'яўляюцца яны ўсе прыхільнікамі творчасці Янкі Купалы або аматарамі літаратуры, ці яны проста прыехалі правесці выхадны дзень на прыродзе, але паэтычнае слова іх закране ў любым выпадку. Тут добра працуюць мікрафоны, а ў паэтаў добра працуюць галасы.

Фота Дар'і Смірновай.

Калі літаратурная дэлегацыя даходзіць да месца выступу, усе месцы ўжо заняты. Прыхільнікаў і аматараў сапраўды дастаткова.

Такія канцэрты звычайна пачынаюцца з пераліку афіцыйных пасадаў і такіх жа афіцыйных прамоў, але тут усе словы гучалі шчыра, сапраўды, як віншаванні з днём нараджэння. Сёлета нагода двайная: у дзень нараджэння Купалы згадалі і 75-годдзе яго музея — аднаго з найстарэйшых літаратурных музеяў Беларусі. Першыя віншаванні — і музею, і класіку — прынеслі галоўныя носьбіты спадчыны паэта: дырэктар музея Алена Ляшковіч і дырэктар Купалаўскага тэатра Павел Латушка.

Усе прамоўцы называлі Купалле ў Вязынцы добрай традыцыяй, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне. Прадстаўнікі ўсіх пакаленняў сядзелі на лаўках, на траве, на камянях. Дзяўчаты плялі вянкі з лісця папараці і каляровых кветак. Нехта фатаграфаваўся каля вялікіх чырвоных літар «Янка Купала». Дзяўчынка з размаляваным тварыкам абдымала кнігу з назвай «Спадчына».

За тры гадзіны, што доўжыўся канцэрт, нават тыя, хто трапіў у Вязынку выпадкова, пазнаёміліся з Янкам Купалам, не толькі згадаўшы вершы са школьнай праграмы, але пераважна пачуўшы тыя, якіх у школьнай праграме няма. Кожны з паэтаў, хто выходзіў на сцэну, чытаў або Купалавы творы, або свае, прысвечаныя класіку. Свята паэзіі аб'яднала ўсіх агульнай тэмай. Літаратары з Мінска, Мінскай і Гродзенскай абласцей выказвалі сваё прычыненне да гэтай тэмы. Таксама павіншаваць беларускага класіка з днём нараджэння завітаў расійскі літаратар Віктар Кулэ — перакладчык вершаў Купалы на рускую мову.

Купала — літаратар сусветнага маштабу. Купала — гэта наша сумленне. Купала — сімвал незалежнай Беларусі. Пакуль мы памятаем пра яго, будзем беларусамі. Такія словы гучалі са сцэны, што часам здавалася: нават партрэт Купалы на сцяне пачырванее ад хвалявання. Але разам з гэтым працягвалі гучаць вершы, якія кажуць пра класіка больш, чым усе ўзвышаныя словы.

Калі пачалася залева, слухачы спакойна апранулі дажджавікі, раскрылі парасоны ці проста схаваліся пад дрэвамі або на ганку, які і служыў паэтычнаму святу сцэнай. Купальскі дождж літаральна зблізіў паэтаў і аўдыторыю, загнаўшы іх пад адзін дах.

Музычная частка святочнага канцэрта была своеасаблівая. Поп-музыка на словы класіка — прэм'ера праграмы «Тутэйшы» Аляксандра Віслаўскага — атрымалася альтэрнатыўным шляхам Купалавых твораў да слухачоў.

Сонечнае надвор'е паступова вярнулася, вакол палатак з ежай і сувенірамі пабольшала народу. На вадзе каля самага берага гайдаліся вянкі з папараці і каляровых кветак. За сцяной галоўнага будынка музейнага комплексу невялікая кампанія гуляла ў штосьці накшталт гарадкоў. Некалькі чалавек сабралася каля ўваходу ў музей і нясмела зазірнулі ў драўляныя вясковыя дзверы: «Вы працуеце? Да вас можна?»

Вязынскі анёл-ахоўнік незаўважна ўсміхнуўся. Місія гэтага свята была выканана.

Дар'я СМІРНОВА

Папараць з вянкоў жаданняў

Самыя дапытлівыя госці наведалі шматлікія экскурсіі фестывалю. Напрыклад, на выставачнай пляцоўцы «Друкарскі двор» можна было не толькі паслухаць расповед пра гісторыю ўзнікнення паперы і кнігадрукавання, пабачыць друкарскі станок, але і стварыць сваімі рукамі паперу для друкавання кнігі, як гэта рабілі ў XVI стагоддзі па тэхналогіі Францыска Скарыны. Побач размясціўся павільён «Кніжны кірмаш». Упершыню тут быў прадстаўлены праект Уладзіміра Ліхадзедава «У пошуках страчанага», які складаецца з 25 кніг і ілюструе гісторыю Беларусі. Пазней прэзентацыя праекта адбудзецца на 32-й Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, дзе Рэспубліка Беларусь возьме ўдзел у якасці ганаровага госця.

А пакуль госці Александрыі з задавальненнем наведвалі майстар-класы, каб ужыцца ў ролю рамеснікаў: майстравалі драўляныя лыжкі, шылі лялек і абярэгі, плялі з саломы і ляпілі з гліны. І з задавальненнем упрыгожвалі сябе купальскімі вянкамі — асаблівай увагай карысталіся майстар-класы па іх пляценні.

— Вянкі на Купалле заўсёды плялі з таго, што расце на лузе. Бралі рамонкі — сімвал чысціні і цноты, валошкі — традыцыйную для Беларусі кветку, — падкрэсліла майстрыха з горада Масты Гродзенскай вобласці Жанна Новік. — Нярэдка ўпляталі зёлкавыя культуры: напрыклад, лён ці авёс, што сімвалізавала дабрабыт. І ключавы момант — лісце папараці. Каб вянок паплыў па рацэ і спраўдзілася мара дзяўчыны, плесці яго трэба з моцным жаданнем, уклаўшы душу. Альбо трэба памятаць, што кожны вянок валодае энергіяй таго, хто яго зрабіў. Таму за сваім сімвалам Купалля неабходна сачыць. Калі вянок вырашыць прымераць іншая дзяўчына, то хутчэй за ўсё жаданне так і не спраўдзіцца.

На імправізаваных вуліцах дынамічнай пляцоўкі можна было сустрэць амаль усе віды дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. А тое, што вельмі спадабалася, можна было набыць на памяць.

Так, на вуліцы «Беларускай» сваю творчаць прадстаўлялі рэгіёны нашай краіны. Цікава было пазнаёміцца з рэгіянальнымі фестывалямі, патанчыць і паспяваць. Вуліца «Міжнародная» — рознакаляровая, яскравая, шумная — паказала каларыт суседзяў, гасцей фестывалю. Тут былі гульні, якія захаплялі з першых хвілін. Напрыклад, украінскія хлопцы памайстэрску ўпраўляліся з хлыстом, адсякаючы толькі вярхушкі кветак. «Прыдняпроўская вуліца» прадстаўляла святы-брэнды Магілёўшчыны: «Свята Лялькі» Круглянскага раёна, «Макавей» Слаўгарадскага, «У госці да Радзімічаў» Чавускага раёна. Шклоўскі раён пазнаёміў са «Святам агурка».

— Беларусы да любога свята ставяцца з вялікай павагай. Яны актыўныя і прадпрымальныя, — адзначае майстрыха Ірына Віктаровіч з Аршанскага раёна. — Я прыязджаю на Купалле ў Александрыю не першы год і бачу, як з кожным разам свята становіцца цікавым усё большаму колу. Сёлета я прывезла з радзімы некалькі варыянтаў ручнікоў. Некаторыя дэманструюць менавіта асаблівасці строю Віцебскага рэгіёна, а іншыя паказваюць агульнабеларускую традыцыю ткацтва. І госці цікавяцца, чым адрозніваецца агульнабеларуская традыцыя ад мясцовай, чаму адны ручнікі больш белыя, а другія з шараватым адценнем. Лічу такую цікавасць добрым знакам: яна сведчыць пра тое, што межы папулярызацыі нашай культуры і гісторыі пашыраюцца.

Фота Вікторыі Аскеры.

Працавала адразу некалькі канцэртных і танцавальных пляцовак, дзе выступалі артысты краін-удзельніц. Народны фальклорны калектыў «Залатыя ўзоры» з Ніжагародскай вобласці прыехаў у Беларусь упершыню. Яго кіраўнік Вольга Белякова адзначае:

— Я неаднойчы чула, што беларускі народ заўсёды шчодра сустракае гасцей. Але тут не проста свята дзеля свята — яно дзеля развіцця творчага патэнцыялу. Атмасфера зачароўвае. Фестываль годна нясе званне міжнароднага.

Госці з задавальненнем частаваліся стравамі беларускай, украінскай і рускай кухні, падкрэсліваючы, што менавіта традыцыйнае меню надае фестывалю асаблівы каларыт. Напоямі і пачастункамі гандлявалі прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў Беларусі, агульная даўжыня гандлёвых радоў перавысіла 1,2 кіламетра. «Купалле» ў Александрыі атрымалася не толькі цікавае, але і смачнае.

Вікторыя АСКЕРА

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

НАСТАЎНІК, КАЛЕГА

Першае маё знаёмства з Міхасём Іосіфавічам Мушынскім, завочнае, адбылося, калі я была студэнткай беларускага аддзялення філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. На чацвёртым курсе нам выкладалі прадмет «Беларуская літаратурная крытыка». І ў якасці дапаможніка рэкамендавалі кнігу Міхася Іосіфавіча «Беларускае літаратуразнаўства і крытыка» (Мінск, 1975). У бацькоўскай бібліятэцы я адшукала гэтую кнігу, пачала чытаць і была ўражана, проста зачаравана лёгкасцю апавядальнай манеры, багаццем слоўніка, тым, як аналізуе літаратурны і крытычны рух таго часу Мушынскі. Карысталася і другімі кнігамі па гэтым прадмеце, але з поўнай адказнасцю магу сказаць, што кніга Мушынскага была на парадак вышэйшая за другія. Акадэмічная і ў той жа час з элементамі навукова-папулярнага стылю, манера пісьма Міхася Іосіфавіча выклікала цікавасць, стымулявала да самастойных роздумаў і пошукаў.

Крыху пазней, у юбілейныя коласаўскія дні, я набыла ў краме цудоўна, з вялікім густам выдадзенную манаграфію «Летапіс жыцця і творчасці Якуба Коласа» і, добра ведаючы прозвішча аўтара, адразу паглыбілася ў чытанне. Праз некалькі дзён мой бацька, вярнуўшыся дадому з «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі», дзе ён працаваў тады галоўным рэдактарам, дастаў з партфеля гэтую ж кнігу Мушынскага і сказаў: «Во, Мушынскі падпісаў сваю новую кнігу. Пра Коласа — жыццё і творчасць. Я на рабоце крыху пагартаў. Які малайчына! Амаль па гадзінах распісана, што рабіў класік!» — «А я ўжо набыла гэтую кнігу, але табе не паказала, бо адразу прынялася чытаць, мяркую, для дыпломнай работы што-небудзь вазьму», — сказала я.

У снежні 1986 года, пасля заканчэння аспірантуры на кафедры беларускай літаратуры БДУ, я прыйшла працаваць у тагачасны Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы, у аддзел (тады ён называўся сектарам) выданняў і тэксталогіі, якім кіраваў Міхась Іосіфавіч. Мушынскі вельмі прыязна мяне сустрэў, расказаў пра работу, якую вядзе аддзел, пра супрацоўнікаў і нават крыху пазнаёміў з традыцыямі, якія на той час ужо склаліся ў аддзеле.

Кіраваў аддзелам Міхась Іосіфавіч з пачуццём вялікага такту, нават з далікатнасцю. Да ўсіх ён ставіўся аднолькава ветліва, з павагай: і да малодшых навуковых супрацоўнікаў, і да старшых навуковых супрацоўнікаў, і да лабарантаў, і да сакратарак. Ніколі не павышаў голас, не інтрыгаваў, хоць кіраваць аддзелам было вельмі няпроста, бо ў ім былі адны жанчыны. Такі спосаб кіравання ўсе мы, супрацоўніцы аддзела, вельмі высока цанілі і былі за яго вельмі ўдзячныя Міхасю Іосіфавічу. Наш аддзел нават жартаўліва называлі радком з калісьці вельмі папулярнай песні: «Восем дзевак — адзін я». І сапраўды, Міхась Іосіфавіч — адзіны мужчына ў аддзеле, а нас, супрацоўніц, — восем. Вельмі любіў Міхась Іосіфавіч дні народзінаў супрацоўнікаў, калі ладзіліся гарбата і кава. Тут ён быў тамадой, расказваў шмат цікавых гісторый і анекдотаў, але больш любіў слухаць анекдоты і заўсёды весела смяяўся. Пры кожнай сустрэчы ён цікавіўся, што новага адбылося, што плануецца, хто чым займаецца, і гэта не была дзяжурная цікавасць: Міхась Іосіфавіч заўсёды стараўся выказаць сваё меркаванне па той ці іншай сітуацыі, даць слушную параду.

Нельга не сказаць і пра яго хобі. Справа ў тым, што Міхась Іосіфавіч займаўся здымкамі на кінакамеру. Здымаў усё, што было для яго цікава. Праяўляў. А потым рабіў прагляды таго, што было ім знята. Заўсёды мы, супрацоўнікі не толькі аддзела, але і ўсяго інстытута, з цікавасцю і захапленнем глядзелі гэты матэрыял. І гэта нягледзячы на тое, што не было гуку і адзняты матэрыял быў чорна-белы.

Некалькі разоў мне даводзілася браць на работу майго сына — малога Ваню, бо не было на каго пакінуць яго дома. Аднойчы я прыйшла з Ванем на працу і стала праглядаць паперы, якія трэба было тэрмінова падрыхтаваць. Святлана Васільеўна Забродская, каб нечым заняць чатырохгадовага Ваню, дазволіла таму перакладаць паперы ў шуфлядах свайго стала. Ваня сур'ёзна паставіўся да гэтай задачы, пачаў з вельмі важным выглядам даставаць паперы з шуфлядак, а потым роўненька складваць іх зноў у шуфлядкі. І тут у аддзел зайшоў

загадчык, убачыў Ваню і ўсклікнуў: «Вось у нас і новы супрацоўнік! Малайчына! Маладую змену трэба рыхтаваць з малых гадоў. Ваня, будзеш тэксталогам?» — «Канешне, буду», — ні на секунду не разгубіўшыся, адказаў Ваня. І гэтым вельмі рассмяшыў Міхася Іосіфавіча.

Шырыня навуковых інтарэсаў Міхася Іосіфавіча проста ўражвала: гісторыя беларускай літаратурнай крытыкі, творчасць Янкі Купалы, Максіма Гарэцкага, Максіма Багдановіча, Міхася Зарэцкага, Івана Шамякіна, тэорыя літаратуразнаўства… Але галоўная навуковая заслуга Міхася Іосіфавіча — даследаванне творчасці Якуба Коласа. Ён стаяў каля вытокаў «Каласавінаў» — міжнароднай навуковай канферэнцыі, якая ўжо некалькі дзесяцігоддзяў праводзіцца Домам-музеем Якуба Коласа і прыняць удзел у якой лічаць за гонар даследчыкі з Украіны, Расіі, Літвы, Латвіі і іншых краін. Кожны год Міхась Іосіфавіч рыхтаваў даклад па адной з праблем коласазнаўства, і вынікам удзелу ў гэтых канферэнцыях стала манаграфічнае выданне «Мае Каласавіны» (яно пабачыла свет у выдавецтве «Беларуская навука»: 1-е выд. — у 2010 г., 2-е — у 2016 г.). Сапраўдны навуковы подзвіг здзейсніў Міхась Мушынскі, падрыхтаваўшы ў 2012 годзе новае выданне «Летапісу жыцця і творчасці Якуба Коласа». Гэты фаліянт у 1127 старонак разы ў чатыры перавышае аб'ём папярэдняга выдання «Летапісу…». Ніводны пісьменнік Беларусі, акрамя Якуба Коласа, не мае такога падрабязнага навукова-абгрунтаванага «Летапісу жыцця і творчасці». Міхась Іосіфавіч падпісаў мне экзэмпляр гэтай кнігі: «Алесі Іванаўне і Сяргею Уладзіміравічу — у знак глыбокай асабістай павагі і з пачуццём шчырага захаплення тым, што яны робяць па зберажэнні памяці і прапагандзе спадчыны выдатнага сына беларускай зямлі, класіка нацыянальнай літаратуры, вучонага, грамадскага дзеяча, носьбіта лепшых рысаў нацыянальнага характару Івана Пятровіча Шамякіна. Жадаю Алесі і Сяргею доўгага шчаслівага жыцця, новых радасцей і новых поспехаў. 23.XII.2012 г. Міхась Мушынскі». Гэтая кніга займае пачэснае месца ў нашай хатняй бібліятэцы.

Маючы багаты вопыт па стварэнні «Летапісу жыцця і творчасці Якуба Коласа», Міхась Іосіфавіч пачаў працу над «Летапісам жыцця і творчасці Івана Шамякіна». Значная частка гэтай працы змешчана ў апошнім, 23-м, томе Збору твораў Івана Шамякіна. Але Міхась Іосіфавіч не спыніўся на гэтым, ён працягнуў працу і далей, каб выдаць летапіс асобнай кнігай. Я мяркую, што гэта кніга з цягам часу пабачыць свет і зойме пачэснае месца сярод грунтоўных работ Мушынскага.

У апошнія гады жыцця, ужо цяжка хворы, Міхась Іосіфавіч рэгулярна тэлефанаваў мне, цікавіўся навінамі. З-за хваробы ён не браў удзел у навуковай канферэнцыі да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага ў лютым 2018 года. Міхась Іосіфавіч вельмі перажываў, што не здолеў выступіць з дакладам на гэтай канферэнцыі. Ён шмат займаўся вывучэннем творчасці Максіма Гарэцкага і, нягледзячы на вялікую колькасць ужо апублікаваных работ па жыццёвым і творчым шляху пісьменніка, заўсёды рыхтаваў новыя і цікавыя матэрыялы. Пасля правядзення гэтай канферэнцыі ён вельмі доўга распытваў мяне, хто і як выступаў, на якую тэму былі даклады і паведамленні. І быў вельмі задаволены, што адбылася такая падзея — юбілейная канферэнцыя да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага.

Міхась Іосіфавіч быў не толькі выдатным вучоным-філолагам, літаратуразнаўцам ад Бога, ён шмат займаўся падрыхтоўкай маладых навуковых кадраў, на працягу многіх гадоў быў нязменным сакратаром савета па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Паспяхова спраўляўся і з гэтай пасадай. На многія дысертацыі і аўтарэфераты ім напісаны станоўчыя водгукі. І я мяркую, што дысертанты былі за гэта яму вельмі ўдзячныя. У апошні час Міхасём Іосіфавічам на філалагічны факультэт БДУ быў перададзены цэлы стос аўтарэфератаў. А колькі разоў ён выступаў афіцыйным і неафіцыйным апанентам на абаронах дысертацый! Я буду ўсё жыццё вельмі ўдзячна яму за яго выступленне неафіцыйным апанентам на абароне маёй кандыдацкай дысертацыі ў 2001 годзе. Акрамя гэтага, ён хваляваўся, як ідуць у мяне справы па афармленні дакументаў і да абароны, і пасля яе. М. І. Мушынскі быў вельмі ўзрадаваны, калі я атрымала дыплом кандыдата філалагічных навук.

Міхась Іосіфавіч апекаваў з абаронай дысертацыі не толькі мяне. Ён падрыхтаваў да абароны кандыдацкай дысертацыі па тэксталогіі Тэрэзу Станіславаўну Голуб, якая зараз з'яўляецца адзіным дыпламаваным кандыдатам навук па тэксталогіі ў нашай краіне. Ён вельмі ганарыўся тым, што нарэшце была абаронена кандыдацкая дысертацыя па тэксталогіі.

Ён быў адкрыты ўсяму новаму, што з'яўлялася ў галіне тэксталогіі, — у нас, у Беларусі, у Расіі, у краінах Балтыі, ва Украіне… Памятаю, я прынесла ў аддзел першы том новага поўнага Збору твораў Сяргея Ясеніна. Міхась Іосіфавіч тут жа пачаў цікавіцца, як падаюць матэрыялы пра паэта расійскія тэкстолагі, якія новыя матэрыялы ўводзяцца ў навуковае выкарыстанне, якія новыя рубрыкі з'явіліся ў томе. Менавіта Міхась Мушынскі актыўна настойваў на тым, каб у новы Збор твораў Янкі Купалы было ўключана ўсё, што напісана рукой Песняра: не толькі мастацкія творы і лісты, але і дзелавыя запісы, нават нумары тэлефонаў. Неабходнасць такога ўключэння тлумачыў тым, што тэксталогія як навука не толькі акумулюе ўсё тое, што назапашана ў тэарэтычным і практычным літаратуразнаўстве і крытыцы, але і дае штуршок для новых даследаванняў літаратурнай спадчыны пісьменнікаў. І спасылаўся пры гэтым Мушынскі на аўтарытэт даследчыкаў з Інстытута сусветнай літаратуры імя Максіма Горкага Расійскай акадэміі навук.

Гэтак жа апантана Міхась Іосіфавіч пачаў знаёміцца з першым томам новага Збору твораў М.В. Гогаля. Калі я, па прастаце душэўнай, звярнула яго ўвагу на тое, што сам тэкст зборніка «Вечары на хутары паблізу Дзіканькі» менш за дзвесце старонак, а каментарыі да яго больш чым шэсцьсот, то Міхась Іосіфавіч мякка мяне ўпікнуў: «Творы Гогаля выходзілі акадэмічнымі выданнямі больш чым дзясятак разоў, а мы выдаём Купалу і Коласа з акадэмічнымі каментарыямі толькі трэці раз. Пачакай, Алеся! І ў нас будуць такія ж багатыя і змястоўныя каментарыі. Тэксталогія як навука не робіцца на пустым месцы, яна крышталізуе ўсе веды па літаратуры і творчым працэсе». Я добра запомніла гэтыя словы Міхася Іосіфавіча, таму што, як мне здалося, яны выразна і коратка характарызуюць тэксталогію як навуку, якой прысвяціў сваё жыццё руплівец на ніве літаратуразнаўства прафесар М. І. Мушынскі.

Алеся ШАМЯКІНА

Таямніцы, міражы і драмы...

Тэматычна разнапланавая, багатая на метафары і вобразы, лірычная падборка Казіміра Камейшы адкрывае чэрвеньскі нумар «Полымя». Кожны верш як самадастатковая карцінка, як узор майстэрства ў адлюстраванні свету і чалавека ў ім, а разам яны складаюць галерэю шматаспектавага існавання душы, выпрабаванняў, праз якія наканавана прайсці, адчування любові: да родных і блізкіх, да зямлі, да жыцця. Ёсць творы, якія гучаць гімнам сялянскага побыту. Яны настолькі натуральныя і нязмушаныя, што асоба творцы падаецца як частка наваколля, арганічна, спакон веку злучаная з краявідам (як не стае такога бачання многім айчынным аўтарам, якія замілоўваюцца рамонкамі-васількамі вясковага лугу, але ў творах якіх не знойдзеш ні арыгінальнасці, ні глыбіні):

У бацькоўскай хаце, пры гары,
Век я свой сялянскі дажываю,
І гарод, нібы кажух стары,
Ніткай гарбузовай зашываю.

Нечаканы, адметны вобраз карціны свету, створанай па аналогіі з гадзіннікавым механізмам у вершы, які даў назву нізцы, — «Гадзіннікавых спраў майстра»:

Хоць і прытомна ёй, руцэ,
А пачынае ўсё з пачатку.
І з лоўчай хітрыкай пінцэт
Хвіліну зноў схапіў за пятку.

Гудзе гадзінніка нутро,
Нібы ў якой неразбярысе.
Тут нават самі зло з дабром
Двума шасцернямі сышліся.

Паэзія Алеся Каранеўскага (падборка «Таемнае сонца душы») адлюстроўвае навакольныя краявіды, дзе паэт-мастак заўважае відочныя і скрытыя сэнсы, таму і напаўняе іх адчуваннем таемнасці. Крыху камічна гучыць высокі пафас верша «Разявака, ён жа пілігрым», бо вобраз вандроўніка, які ідзе па дарозе таямніц і міражоў, зазямляецца прастанародным вызначэннем «разявака». Хаця, магчыма, у тым і была задума аўтара...

Сяргей Давідовіч у падборцы вершаў «Пік жыцця» разважае пра няпростыя рэаліі, лірычны герой з адчуваннем незадаволенасці сабой падсумоўвае перажытае...

Згадкі маленства Уладзіміра Гаўрыловіча (апавяданне «Краіна Валодзькава») раскрывае чароўны свет дзяцінства, яго светлыя моманты і трагедыі, якія цяпер, на адлегласці гадоў падаюцца маленькімі, а ў момант перажывання былі велізарныя. Як ёсць паняцце арт-тэрапіі (уздзеянне на псіхаэмацыянальны стан пацыента выяўленчай творчасцю), так і адносна падобных пісьменніцкіх рэчаў можна было б увесці вызначэнне ўспамінатэрапіі, калі, перажываючы і прагаворваючы пэўныя балючыя моманты, вызваляешся ад уздзеяння на псіхіку мінулых крыўдаў і адначасова напаўняешся станоўчай, жыццесцвярджальнай сілай, калі ўзнаўляеш у памяці добрае і светлае.

Апавяданні Віктара Кунцэвіча «Што падкажа сэрца...» і «Мы яшчэ пагаворым» паказваюць ва ўсёй сваёй паўнаце сямейныя канфлікты. Фінал у абодвух застаецца адкрыты: аўтар не жадае дапамагаць у вырашэнні складаных пытанняў узаемаадносінаў сваім героям, — маўляў, хай самі разбіраюцца, раз «заварылі кашу»... Дый жыццё было б надзвычай простае, калі б адпаведныя творы давалі гатовыя рэцэпты.

Таццяна Мушынская працягвае знаёміць чытачоў з асобай бацькі, выбітнага даследчыка Міхася Мушынскага. Вобраз, які яна стварыла з любоўю і цеплынёй, рэальны, жывы — аўтарка расказала не толькі пра дадатныя бакі, а і пра супярэчнасці, якія былі ў жыцці вучонага. Шмат як пра чалавека гаворыць той факт, што ён збіраў анекдоты, бо вельмі цаніў гумар і любіў пасмяяцца і рассмяшыць суразмоўцу. Зразумела, што не толькі ў гэтай якасці яго характару сакрэт жыццялюбства і высокай працаздольнасці, але скіраванасць ва ўсім бачыць хутчэй станоўчае, чым кепскае дадае выразныя, адметныя штрыхі да партрэта.

Рубрыка «Галасы свету» знаёміць з вершамі сучаснага славацкага паэта Яраслава Рэзніка, перастворанымі па-беларуску Таццянай Сівец.

Яна БУДОВІЧ

З МАРАЙ, ТОЛЬКІ З ЁЙ

«Нёман» адкрывае міф Васіля Гігевіча «Востраў» (пераклад Уладзіміра Пятрова). У арыгінале пазнаёміцца з гэтым творам маглі яшчэ ў мінулым годзе чытачы «Маладосці» (№ 9, 2018). Тады міф суправаджаўся невялічкім інтэрв'ю Васіля Гігевіча. Пісьменнік заўважаў: «Востраў» трэба разглядаць у звязцы з іншымі творамі, у прыватнасці «Карабель» і «Страчанае шчасце».

Уладзімір Арлоў лічыць: «аўра бессмяротных геніяў дапамагае нам, простым смертым, паэтызаваць жорсткую прозу жыцця». Да 220-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна аўтар надрукаваў свае нататкі пад назвай «Я стаў цнатлівы…» («Я стал целомудрен…»). Дапамагла яму ў гэтай справе вандроўка па горадзе, дзе некалі бавіў час вялікі паэт, па Кішынёву. У адвольным парадку Уладзімір Арлоў падае звесткі пра месцы, дзе жыў паэт, людзей, што паўплывалі на яго лёс, прычыны шматлікіх дуэляў, а ўвогуле — пра ўсё тое, чым мог натхніцца Пушкін.

Апавяданне «"Пакой цудаў" братоў Глумлевых» («"Комната чудес" братьев Глумлевых») — твор з дакладна акрэсленымі тэмай і ідэяй. Сюжэт хоць і не выяўляе месца і час дзеяння, але вядзе за сабой, нібыта дэтэктыў ці прыгодніцкі аповед. З'яўляюцца браты-чараўнікі, якія ажыццяўляюць мару двух сытых прадпрымальнікаў. Каб трапіць да братоў, герой і яго сябар нават не сустракаюць на шляху ніякіх перашкод, у тым ліку не вядзецца гаворка пра грашовыя страты наведвальнікаў незвычайнага пакою. Але бліжэй да сярэдзіны твор прымае псіхалагічны кірунак: здзейсненая мара ператвараецца ў жах, выблытацца з якога чалавек можа толькі сам. Ідэя аўтара не ў тым, што шчасце нельга купіць: некаторыя мары павінны імі заставацца — бо «…з марай і толькі з ёй жыццё надзвычай цудоўнае».

Сяргей Філіпаў у нізцы вершаў «Наша галоўная сіла» звяртаецца да чытача нібыта з другой эпохі — той, што прайшла. Погляд на сучасніка можа выклікаць неразуменне, бо аўтар бачыць яго чамусьці толькі ў кантэксце дзвюх крайнасцяў — «не галодным і вельмі свабодным, нават, пэўна, занадта». Чалавек, які даволі прадузята і памылкова ўспрымае свет — асноўны аб'ект аўтарскіх разважанняў. Не цураецца Сяргей Філіпаў і роздумаў наконт капіталізму і сацыялізму, часам акцэнтуючы ўвагу на тым, што, маўляў, перавяліся інтэлігенты. У чым бачыць сілу паэт, дык у разуменні людзей і, не баючыся моцных эпітэтаў і ацэнак, выносіць прысуд:

Если люди убоги,
Не добры и предвзяты,
Не спасут диалоги,
Не помогут дебаты.

Тугой па былым напоўнена паэтычная падборка Анатоля Зэкава «Праз сёлы, дзяцінства вёскі» («Через сёла, детства веси», пераклад Аляксандра Стрыгалёва). Гэта традыцыйныя ў сэнсе тэм, сімвалаў, вобразаў, рыфм вершы, якія напісаныя хутчэй пра сябе і для сябе. Той жа мытыў тугі па вёсцы, якую чалавек пакідае ў юнацтве, але нібыта праносіць сум па ёй праз усё жыццё, наганяе на чытача ўжо сум іншага кшталту. Магчыма, паэт (дарэчы, майстар гумарыстычнага жанру) звярнуўся не да сваёй тэмы — вынік спробы красамоўна пацвярджаюць апошнія радкі падборкі:



Стихи в деревне не пишу,
с иной сохой — её стихия.
Вот впечатленья — привожу,
и за стихом пишу стихи я.

Прыкметна вылучаецца Дар'я Дарошка з нізкай вершаў «Я птушка, што лятае навобмацак» («Я птица, летающая на ощупь»). Бачанне свету лірычнай гераіні хутчэй пачуццёвае і не паддаецца лагічнаму тлумачэнню. Хоць месцамі аўтар не ведае меры ў наслойванні вобразаў, што перашкаджае наблізіцца да разумення закладзеных у яго сімвалаў і ідэй, кожны верш — своеасаблівы эксперымент і па форме, і па змесце.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Скрынячка радасці ды суму

Чэрвеньскі нумар «Маладосці» прысвечаны постаці Пушкіна і насычаны тэгам «Асцярожна: Пушкін — 220». Ці азначае гэта, што проза і паэзія будуць падуладныя тым формам і ідэям, якія былі ўласцівыя творчасці генія? Не зусім. Толькі гэта не памяншае цікавасці да твораў, змешчаных на старонках часопіса.

Калі казаць пра форму некаторых паэтычных спроб «маладосцеўцаў», то гэта, сапраўды, вясёлае перайманне, па змесце атрымліваецца дыялог часоў і прастор. Гэта пацвярджае верш «кіберэлегічнасць» Алеся Дваракова, з якога і пачынаецца паэтычная частка «Маладосці»:

Скажы, ці ззяеш ты дарэмна
Той прыгажосцю незямной?
Бо Інстаграм твой — што арэна,
І на яго ідуць з вайной
Трывогі жорсткія імгненні,
Фрагменты кпінаў ад чужых.

На гэткай жа жартаўлівай ноце пабудаваны і верш «Руслан і Людміла. XXI ст. *version.by*» Алёны Беланожкі, у якім кот вучоны вядзе з-пад дуба модны блог, русалка пяе новы хіт, а трыццаць віцязяў з марскім дзядзькам паўстаюць на дошках нібы сёрферы. Вяселле Руслана і Людмілы падаецца ў тых жа рысах — дзесьці гэта гратэск, дзесьці іронія, дзесьці жарт, але разыходжанняў з сюжэтам паэмы няма: верш завяршаецца на моманце выкрадання нявесты. Цікава, якія перастварэнні маглі б чакаць працяг гісторыі?

Стах Лысы прытрымаецца думкі, што мастацтва пачынаецца не тады, калі ўзнікае ідэя, але калі нараджаецца вобраз. Сапраўды, нізка вершаў «А потым волю зведаў першы ліст» напоўненая традыцыйнымі вобразамі для хрысціяніна-каталіка: човен і рыбакі, гром і буйныя хвалі, прагулкі па вадзе… Толькі гэта не проста вобразы, уплеценыя ў сюжэт, — яны ствараюць сапраўдныя карціны, поўныя дзеяння і яркіх фарбаў.

Паэтычная падборка, якую прапануе Андрэй Козел «Ты не прыйшоў у вызначаны час», — вельмі разнародная. У кожным вершы свая тэма, ідэя, танальнасць, таму цяжка скласці агульнае ўражанне. Аўтар нібыта сам не можа вызначыцца, пытаючыся ў сябе: «Я быў агонь ці Праметэй?».

Верш Марты Багдановіч «Духмяны кавалачак шчасця, лагоды…» не патрабуе тлумачэння ці пошуку ў ім надзвычайных ідэй, бо прысвечаны той радасці, што ўзнікае ў любой сям'і са з'яўленнем дзіцяці. Тое, што прынёс «бусел» здалёк, апяваецца з такой цеплынёй і пяшчотай, што прадказвае вершу папулярнасць.

У адрозненне ад лёгкай, напоўненай іранічнасцю паэзіі, проза нумара не абяцае забаўляльнага і ненапружлівага чытання. Так, у майскай «Маладосці» друкаваліся вершы Настассі Нарэйкі, а зараз ёсць магчымасць пазнаёміцца з апавяданнем аўтара «Светлячок». Кароценькая даведка перад тэкстам падкрэслівае — твор патрэбны ўсім. Бясспрэчна, ён цікавы сваёй смеласцю: калі абвяшчаецца першаснасць свабоднага выбару, такая ледзь прапісаная, але дакладна ўспрымальная мараль можа выклікаць ухваленне адной часткі чытачоў і абурэнне другой. Дастаткова нават адной згадкі тэмы для таго, каб узнікла дыскусія, але аўтар нават ніводнага разу не назвала прадмет магчымай спрэчкі. Пазнаёміцца з апавяданнем варта, якраз не ведаючы ідэі твора, каб зразумець не толькі аўтарскую задуму, але і сваё стаўленне да праблемы.

«Тры маналогі» і «Ліст да Чарлза Букоўскі» Ганны Комар — быццам псіхалагічная разрадка для аўтара (ці герояў твораў), але не для чытача. Гэта, вядома, у залежнасці ад стаўлення чалавека да сябе і наваколля, але твор здатны пакінуць цяжкае ўражанне непапраўнасці памылак, ад якіх залежыць не толькі сваё, але і чужое жыццё.

Апавяданні Арыны Гардзей маюць алегарычны пачатак. Героі яе твораў — хутчэй сістэмы пэўных пачуццяў, думак і жаданняў, чым сапраўдныя постаці. Так, твор «Вырай» — найбольш яскравы прыклад. Ён распавядае пра птушак у клетцы, якія вымушаны існаваць, не разумеючы ў гэтым сэнсу і не ведаючы саміх сябе. Прытым заўсёды існуе нешта большае і значнае — гаспадар. Ёсць ён і ў апавяданні «Скрынячка з нечым звонкім», дзе сапраўднае жыццё пераблыталася з жыццём ірэальным: свет цацак сапраўды ў нечым падобны да свету людзей, ці не так?

Яўгенія ШЫЦЬКА

ЛАСТАЎКА З МАЛАГІ

Гісторыя літаратуры пацвярджае жорсткую ісціну: большасць пісьменнікаў, якія жывуць і ствараюць у пэўны прамежак часу — усяго толькі планктон, аснова для падмурку, на якім наканавана застацца нямногім. Няўмольны і бязлітасны суддзя — Час — раней ці пазней усім адводзіць сваю ролю, незалежна ад пасад, колькасці ўзнагарод, палітычных і эстэтычных поглядаў.

Але акрамя знешняй, фармальнай функцыі напісання тэкстаў, у кожнага літаратара ёсць асобная, не заўсёды відавочная звышзадача. У некага гэта — пасіянарная місія абуджэння нацыі, у кагосьці — усталяванне гістарычнай справядлівасці, хтосьці служыць голасам, рупарам пакалення…

У маладой паэткі, пра апошнюю па часе выдання кнігу якой пойдзе сёння гаворка, адна з місій (прынамсі, на сёння вельмі актуальная і важная) — прысароміць нас, жыхароў зямлі пад белымі крыламі, унікальным прыкладам сваёй самаахвярнай, бескарыслівай любові да Беларусі, да яе мовы і культуры:

Называлі мяне беларусы ледзь не гераіняй,
А на справе я толькі дзяўчынка: малая, слабая,
І мой голас губляецца ўжо, як Хрыстос у пустыні,
Бо я птушка марская — хварэю, калі прылятаю.

«Колер крылаў» — зборнік пад такой назвай пабачыў сёлета свет у выдавецтве «Кнігазбор» у серыі «Кнігарня пісьменніка».

Але яшчэ раней, у 2017 годзе, адбылася знакавая падзея — у Мадрыдзе на дзвюх мовах — іспанскай і беларускай — выйшла кніга Максіма Багдановіча «Згукі маёй Бацькаўшчыны» *(«Ecos de mi tierra»)*. Выданне было прымеркавана да 100-годдзя са дня смерці паэта.

Пераклала вершы менавіта яна — Анхела Эспіноса Руіс, ураджэнка Малагі, аўтарка некалькіх уласных паэтычных зборнікаў на беларускай мове, дыпламантка і лаўрэатка айчынных конкурсаў і прэмій.

Гэта невыпадкова і сімвалічна: творцаў раздзяляе стагоддзе; абое палюбілі Беларусь і спасцігалі яе здалёк; абое філолагі-паліглоты, апантаныя словам. Але галоўнае — яны падышлі да справы свайго жыцця са свежым поглядам, з несапсаваным умоўнасцямі ўспрыманнем, але ў той жа час валодаючы арсеналам, неабходным для творчага раскрыцця. Чаму ж цяпер, як і сто гадоў таму, выбар быў зроблены на карысць беларускай мовы? Нашы літаратуразнаўцы ўжо спрабавалі разгадаць загадку Максіма-кніжніка, таямніца ж Анхелы Эспіносы толькі чакае свайго даследчыка. Гэтаксама, як і ў Багдановіча, у яе творчасці пад знешняй акадэмічнай стрыманасцю і строгім класічным радком праступае неўтаймоўная пачуццёвасць і жывая, пульсуючая эмоцыя. Часам здаецца, што два творцы нібыта вядуць своеасаблівы паэтычны дыялог праз стагоддзе:

Але расстацца нам час наступае;
Пэўна, ўжо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але расстацца нам час.
(Максім Багдановіч «Зорка Венера»)

Не вінаваць сябе, мілы, не трэба!
Лёс даў суворы наказ:
Наша расстанне было воляй неба —
Зоркі былі супраць нас!
(Анхела Эспіноса Руіс «Зоркі былі супраць нас»)

Увогуле, паэтычная частка «Колеру крылаў» — гэта выбранае з ранейшых кніг паэткі. Прычым не ўсе вершы са зборнікаў «Раяль ля мора», «Памяць пра будучыню», «Pomme de ciel», «Бяскрылле ў вялікім горадзе» ўвайшлі ў новае выданне, што сведчыць аб высокай патрабавальнасці да сябе. «Я жыву ўнутры кніг: у забытых старонках і думках», — прызнаецца яна. Яе паэзія — пазачасавая, сканцэнтраваная на глабальных, універсальных катэгорыях, такіх як вернасць, чалавечнасць, прызначэнне творцы. Пра гэта сведчыць, напрыклад, трыпціх «Агапэ», «Філія» і «Эрас», дзе аўтарка раскрывае сваё бачанне і разуменне любові як найвышэйшай ступені ўзаемаадносін паміж людзьмі:

Рука матулі лашчыць першы раз малога,
Брат абараняе сястру перад холадам,
Дзядуля вучыць унука гуляць у шахматы,
Сябры забываюць праблемы абдымкамі...
Дык веру ў агапэ.

Фізічнае, зямное каханне — таксама адна з самых галоўных тэм Анхелы Эспіносы. Але эратызм тут натуральны, не здушаны комплексамі, не скаваны паўнамёкамі і не заплямлены пошласцю, у яе вершах прысутнічае сапраўдная «…маладая, святая, зямная любоў», а «душа з душою займаюцца каханнем».

І ў той жа час — шыкоўная метафорыка, яркія, запамінальныя вобразы:

Ластаўка цемры ляціць да парога,
Ў ружах губляюцца сны…

Адметна, што дзякуючы зборніку можна прасачыць цікавую творчую эвалюцыю паэткі: калі першыя дзве кнігі прадстаўлены пераважна верлібрамі, то пачынаючы з *«Pomme de ciel»* (перакладаецца з французскай як «Нябесны яблык») яна паступова пераходзіць на класічныя вершаваныя формы.

Але падаецца, што да выбранага з апошняй кнігі «Бяскрылле ў вялікім горадзе» было крышку несур'ёзнае стаўленне: напрыклад, тут змешчаны творы, якія больш нагадваюць прозу: «10 рэчаў, якія я люблю», «10 рэчаў, якія мне не падабаюцца», «10 фактаў пра мяне». Яны ўяўляюць сабой простыя пералічэнні, набор пунктаў. Рэч у тым, што гэткія разнастайныя «спісы цікавостак» даўно ўжо набілі аскоміну ў медыйнай прасторы, а як паэзія яны наогул не ўспрымаюцца. Улічваючы, што ў «Колеры крылаў» прысутнічае празаічны раздзел, — чаму было не ўключыць гэтыя «вершы ў фэйсбучным фармаце» туды? Тым больш што паэтка не пазбаўлена самакрытыкі, пра што сведчаць такія радкі:

З майго пустаслоўя
Расце, расце
Паўверш, паўхлусня…

Астатнюю частку зборніка складаюць апавяданні, эсэ, крытыка, калумністыка і пераструварэнні вершаў з бенгальскай, англійскай, іспанскай, польскай, чэшскай, рускай, японскай моў. У сваёй прозе і эсэістыцы Анхела Эспіноса гранічна шчырая, непасрэдная, але без уласцівага маладому ўзросту інфантылізму: здзіўляе глыбіня разваг, нечаканасць высноў, вобразнасць. А па тым, якіх паэтаў яна перакладала, можна меркаваць і аб літаратурных густах (дарэчы, вельмі разнастайных): тут і Рабіндранат Тагор, і Федэрыка Гарсія Лорка, і Пабла Нэруда, і Боб Дылан… Яна сама прызнаецца: «Было б сумна, калі б я не выкарыстоўвала свае моўныя веды [……...] дзеля таго, каб па-беларуску прагучалі творы замежных літаратур».

Феномен Анхелы Эспіносы Руіс не абмяжоўваецца адно іншаземнай экзотыкай. Перад намі — у першую чаргу яркая, самабытная пісьменніца, талент якой яшчэ толькі набліжаецца да росквіту, але якая ўжо цяпер мае за плячыма немалыя творчыя набыткі і ўдзячную, зацікаўленую аўдыторыю.

Анхеле Эспіносе Руіс хочацца пажадаць, каб паэтычныя крылы, вобраз якіх чырвонай ніткай працінае ўсю яе творчасць, мацнелі і ўдасканальваліся, і надалей дорачы аўтарцы ні з чым не параўнальнае адчуванне высокага палёту.

Янка ЛАЙКОЎ

Імгненні кахання



Інтымная і медытатыўная лірыка, філасофскі роздум над непаўторнымі і хуткаплыннымі імгненнямі жыцця — гэтыя матывы сталі асновай кнігі паэзіі Валерыя Максімовіча «Любви дарованной мгновенья», што сёлета пабачыла свет у сталічным выдавецтве «Право и экономика». Зборнік складаецца з чатырох раздзелаў, у якіх у храналагічнай паслядоўнасці прадстаўлены вершы і паэма, створаныя ў апошнія гады. Упершыню аўтар публікуе юнацкія вершы, што па-асабліваму выяўляюць галоўныя эстэтычныя і этычныя інтэнцыі паэта, вернасць якім ён захаваўся ў сталай сваёй паэзіі, значна больш ускладненай у змястоўна-сэнсавым і фармальна-стылістычным планах. У зборнік таксама ўключаны пераклады вершаў на рускую мову паралельна з беларускамоўнымі арыгіналамі, што дазваляе ацаніць майстэрства і якасць перакладу. Аўтар прысвяціў зборнік памяці маці, ёй жа прысвечана і нізка вершаў «Ты ў маім сэрцы, мама».

Этыка-эстэтычнымі арыенцірамі для В. Максімовіча з'яўляюцца вечныя каштоўнасці: родная зямля і малая радзіма, святло мацярынскай любові, родныя і блізкія людзі, каханне ва ўсёй сваёй паўнаце, творца і яго місія на зямлі. Са зборніка як паэтычнага цэлага вынікае думка, што паэту важна захаваць свой унутраны свет, напоўнены прагай жыцця і любові да ўсяго жывога, культываваць захопленае стаўленне да зямной прыгажосці, прыгожага ў жыцці. Галоўным маральным імператывам для паэта з'яўляецца выратавальная і ўсёпераможная любоў да ўсяго існага, да найвышэйшых каштоўнасцяў, да ісціны, прыгажосці, якая служыць увасабленнем высокага духоўнага пачатку. Унутранае жыццё паэта прадстаўлена досыць яскрава, а аўтабіяграфічнасць толькі ўзмацняе ступень спавядальнасці, адкрытасці.

Лірыка В.Максімовіча характарызуецца складанасцю фармальнага і змястоўнага плана, дзе змяшаліся розныя адчуванні, перажыванні, пачуцці, туга па высокім, адухоўленым ідэале, у аснове якога — неўміручае, усёпераможнае каханне. Паэтычная свядомасць як бы падмацоўвае вядомае сцвярджэнне, што каханне — гэта драматычнае пачуццё, якому супрацьпаказаны эйфарыя і супакаенне. Аўтар дэкларуе не толькі боль, найвышэйшую напятасць пачуцця, але і сцвярджае думку, што падобны ўнутраны стан натхняе, уздымае на недасяжную вышыню разняволення, прыводзіць у захапленне, спрыяе таму, «чтобы душою восторжествовать / И во сто крат стать чище и сильнее» («Раздумье»). Вось чаму пры ўсіх магчымых метамарфозах каханне для паэта застаецца «живительной целебною водой, / Дарующей божественною негой» («Тебе»).

Каханне ў паэзіі В. Максімовіча заўсёды канкрэтнае, персаналістычнае, тут няма месца абстракцыям. Лірычнае пачуццё адрознівае падкрэсленая суб'ектыўнасць. У паэме «Мой мир», якая ўяўляе сабой своеасаблівую квінтэсэнцыю каштоўнасных установак аўтара, выразна гучыць матыў узвышэння любові і прыгажосці, якія з'яўляюцца арганічнымі, запатрабаванымі людзьмі духоўнымі субстанцыямі. Прычым важная менавіта іх духоўная, метафізічная значнасць: менавіта ў такой якасці яны складаюць паўнату і насычанасць жыцця, самыя лепшыя яе імгненні.

Паэтычная рэальнасць зборніка адлюстроўвае наяўнасць алюзій і рэмінісцэнцый, багацце скрытых цытат з творчасці класікаў сусветнай літаратуры, што, у сваю чаргу, прыводзіць да пашырэння сэнсавай напоўненасці аўтарскай мастацкай прасторы, падкрэслівае дыялагічнасць культур, выяўляючы той несумненны факт, што аўтару падуладныя рознаўзроўневыя ў тэматычным, стылявым і фармальным планах паэтычныя тэксты. Так, аўтарскія радкі «увидеть это чудное виденье», «ты продлись, моё очарованье», «не чуждо мне природы ликованье» ўтрымліваюць рэмінісцэнцыі вершаў А. С. Пушкіна «К*** ("Я помню чудное мгновенье...")» і «Осень». А радок «Играть в слова или играть словами» адсылае чытача да вядомага верша Б. Ахмадулінай. Безумоўна, аўтар стылістычна і семантычна абыгрывае гэтыя знаёмыя элементы іншага паэтычнага тэксту, дэманструючы не толькі выдатнае веданне паэзіі, але і валоданне прыёмамі мастацкай выразнасці, што ўзбагачае паэтычныя вобразы дадатковымі асацыятыўнымі сэнсамі. Аўтар звяртае пільную ўвагу на паэтыку верша. Паэтычныя радкі, і гэта варта адзначыць асабліва, адрозніваюцца адмысловай меладычнасцю, камертанальнасцю, рытмічнай зладжанасцю, настальгічна-шчымлівымі, чуллівымі ноткамі, якія кранаюць самыя патаемныя струны душы. Рэфлексіўнае светаадчуванне аўтара адлюстроўвае духоўнае аблічча яго лірычнага «я», што напружана і праніклива ўглядаецца ва ўласнае жыццё, ацэньваючы ўплыў знешніх абставінаў, якія актывізуюць стваральную дамінанту, спрыяюць унутранаму руху душы.

Паэт імкнецца асэнсаваць складаны духоўны свет свайго сучасніка, дэкларуючы пачуцці міласэрнасці, спагады, хрысціянскай дабрачыннасці, услаўляе вечную рапсодыю жыцця. Галоўная думка паэта заключана ў сцвярджэнні гарманічнага існавання чалавека ў свеце.

Інэса МАРОЗАВА

Алесь СПІЦЫН

***

Руіны старых будынкаў.
Плямы бітай цэглы ў пяску,
Бы лужыны крыві
Забітага мінулага...

На аскабалках
Бетонных падпораў —
Не роспач,
Але маркота
Прысела...

Прысяду і я поруч,
Падумаць
Аб вечнасці...

***

Працуе,
Нібыта асілак,
Драбілка —
Разбітыя ў шчэбень,
Старыя будынкі,

Разбітыя ў шчэбень,
Што стане дарогай…

Вось гэтак не мала
І гэтак не многа

Бывае з мінулым
Па новых стандартах.

Але, калі знікне
На планах і мапах,

Запомні:
Мінулае
(Хай і нябачна)

Усё ж непазбежна
Ляжыць пад асфальтам...

***

Складаюцца бочкі
З атрутай, з атрутай.
Атрута таксама на штосьці патрэбна.
Жыццё абрастае
Пакутай, пакутай.
Пакута таксама патрэбна, напэўна...

А нам жа шанцуе,
А нас жа праносіць,
Хоць, здэцца, няма ні нагод ні прычынаў.
Мы дзякуем небу,
Не верачы лёсу,
І ў часе шукаем крыху адпачынку.

І хочацца скардзіцца, зрэдку бывае,
І з Богам спрачацца, не ўбачыўшы выйсця.
А Бог міласэрна наўсцяж прабачае,
Каб мы між пакутаў пабачылі літасць...

І зноў нам шанцуе,
І зноў нас праносіць,
Хоць кожнаму жытка не пласт
марцыпанаў,
Мы неба каштуем,
І травы, і росы,
І кветкі пакуль што для нас
зацвітаюць...

А многія мкнуцца
Пабачыць нястачу
І болей атруты стварыць і дакласці,
А людзі майстры
І падбіць, і падначыць,
Адзін у адным забіваючы радасць…

Складаюцца бочкі,
З атрутай, атрутай.
І краны працуюць, працуюць,
працуюць.
І хутка з атруты,
Атруты, атруты
Дарогі й масты, і дамы пабудуюць...

***

Ёсць нешта агульнае ў гразі й туману:
Рамантыка холаду й выпрабавання,

Ці мара, ці стома, ці здані начныя,
Ці боль за шляхі, што былі не прамыя,
Ці крыўда за тое, што міма ды міма
І злосць ад таго, што завязнула шына...
Мароз згалалёдзіць пясок на дарозе,
Гравійка ў разорах як сэрца ў трывозе,
І ў тэрмасе скончыцца, можа, гарбата
патрэбна кудысь выбірацца нахрапам...

Шкада, што пакутна мінаюць гадзіны,
Гадзіны ў жыцці непаўторна-адзіным,
У гразі ды мройве, мройве ды гразі,
Маркоце пустой, ненатоленай празе,

У зданезмаганні, заўчаснай пакоры...
Не бачна ў тумане Сіная й Фавора
Ёсць нешта агульнае ў гразі й туману:
Рамантыка холаду й выпрабавання...

У гразі й тумане стамляецца кожны
І толькі надзея, што выбрацца можна,
Яна... Суцяшае? Як гэта завецца?
Адная надзея мне ў знакі й даецца.

Хай мерзну ў напрузе, ды ўсё ж спадзяюся,
Што ты адагрэеш, калі я вярнуся...

***

Сонца ўжо села і стала паныла —
Гэтак, як сэрца, рэальнасць астыла.

Толькі што ярка — і цьмяна ўжо стала —
Гэтак, як сэрца, што перакахала.

Ціха згасаюць пунсовыя хмары —
Гэтак, як сэрца, што страціла мару.

Сталі маркотныя дрэваў абрысы —
Гэтак, як сэрца, не хоча больш высі.

Цьмянымі робяцца жадныя фарбы —
Гэта, як сэрца, што болей не прагне.

Робіцца неба сшарэла-бялёсым —
Гэтак прызначана рухам нябёсным.

Дзень надвячорак нязменна чакае,
Сонца за гмахам планеты знікае.

Скульсьці з усходу сутонне прыходзіць,
Холад і росы з сабою прыносіць.

Хай гэтак будзе і хай так вядзецца —
Толькі, як дзень, не згасала каб сэрца.

Толькі б гарэла балюча й салодка,
Нават згасала ды ўспыхвала зноўку.

Вечна гатовая ў бітву й лавітву,
З верай гукала ў нябёсы малітву.

Будуць заходы і будуць світанкі…
Божа, дай полым, бы ў першым каханні...

***

Мне хапае пакутнага холаду —
Не трэба ўжо больш!
Ледзянучае полымя горада
Атручвае ноч…

Я хацеў захінуцца святамі,
Ды маю тугу.
Я хацеў бы стаць абыякавым,
Але не магу.

Я хацеў бы схавацца птушкаю
У цверджу лясоў,
Але мой супакой узрушаны,
Узрушаны зноў…

Мяне зноў турбуе нябачнае,
Няз'яўлены строй.
І шляхі адыходныя страчаны,
Прызначаны бой…

Здані ўсіх задурманьваюць крозамі,
Спрэс штосьці не так,
Я сярод чалавечай штодзённасці
Шалёны дзівак.

Час для бітвы абвешчаны знакамі,
Гадзіна суду.
Ды я ведаю: хоць заплаканы,
Я перамагу…

***

Калі не знайшоў нічога,
Калі ад кагось застаўся —
Не страшна...
Але нягодна,
Калі шукаць не збіраўся.

Калі ты растраціў срэбра
На марнасць,
Не тым аддаўшы —
Не страшна,
Але, павер мне,
Скарб закапаны
Страшны.

Калі ты зламаў ці збэсціў,
Калі замачыў ці спляжыў —
Не страшна,
Не штодзень ручыць.
Не скарыстацца страшна...

Не бойся спробаў няверных,
Не бойся фальшывых стартаў —
Страшна (і гэта пэўна!)
Жыць, не спрабуючы нават...

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

Жаданне імклівага спеву дарог

Праўда

Яна блукала па лясах.
Паміж азёраў, рэк маўклівых,
Жыла ў птушыных галасах.
У кронах дрэваў гаманлівых.
Яе шукалі за сялом
І ў тлуме гарадскіх праспектаў.
Яна сядзела за сталом,
Калі ніхто не бачыў гэта.
Яе чароўны чысты твар
(Убачыш — з памяці не сцерці)
Распальваў у душы пажар
І раптам нёс трывогу ў сэрцы.
З ёй так хацелася пайсці
Наўсцяж да мэты запаветнай.
Каб разам крочыць па жыцці
Дарогаю, прамой і светлай…
Яе зноў не пускалі ў дом,
Яе баяліся шалёна
І ночкай цёмнаю, і днём,
Ёй слалі грозныя праклёны.
Ды на апошнім рубяжы,
Калі надзея ў міг прапала,
Яна зноў пачынала жыць,
Яна з пакутаў паўставала.
Нібыта сцежачка ў траве,
Нібы крынічка ў полі голым.
Бо без яе загіне свет.
Не зварухнецца часу кола.

***

Жаданне дарогі ізноў ажыве,
Што спела паволі…
У клетцы не будзе спяваць салавей,
А толькі на волі.
Змарыўся, стаміўся, скарыўся, заснуў,
Схаваўся ад змогі,
Ды раптам падзьмула ізноў на вясну —
І клічуць дарогі.
І сэрца надзеяй напоўніцца зноў
Ад сонца праменняў.
Ад водару кветак, абсягу палёў,
Ад светлых імгненняў.
Я дзякую лёсу, што ў сэрцы збярог
Праз часу аковы
Жаданне імклівага спеву дарог
У руху вясновым.

***

Памяці мамы

Свеціш, нібыта сонца,
Светлым і ясным лікам,
Мама — Сама Высокасць,
Мама — Сама Вялікасць.
Быццам абраз ажыўшы,
Ты праз гады мне свеціш,
Кожнай тваёю жылкай
Я ёсць у гэтым свеце.
Многа мне або мала
Лёс падарыў хвілінаў,
Толькі мне свеціць мама, —
Ціхім святлом для сына.

***

Ёсць нейкі гук у цішыні начной,
Калі гучаць мелодыяй таемнай
Няспраўджаныя песні і паэмы
І вершы, не напісаныя мной.
О, гэты момант чуйнай цішыні!..
Калі так сэрца соладка трапеча,
Калі душа згарае, быццам свечка,
У спапяляльным стоеным агні…
У кубку стыне недапіты чай,
І ў цішыні, здаецца, свет чакае,
Што загрукоча за акном трамвай,
Які нарэшце раніцу гукае.

***

На небе хмары, як гады,
Звісаюць над халодным полем.
Мінае ўсё. Айчыны дым
Не пройдзе над зямлёй ніколі.
Бо гэты сцішаны напеў
Нябёсаў над зямлёй вячыстай
Звініць праз ноч у кронах дрэў
Любоўю, светлаю і чыстай.

***

Памяці сяброў

Адлятаюць, нібы лісце з дрэў.
У далёкі вырай адлятаюць
Тыя, каго я праз лёс сустрэў.
І ў смузе маркотнай моўчкі таюць...
Хто пайшоў навечна да пары
І каго так горка не хапае...
Пачакалі б хоць крыху, сябры,
Бо ніхто з той далі не вяртае.
Зноў палае ярка лісця медзь
Пад халодным перадзімным сонцам.
Памяць толькі можа сілу мець
У вірлівым мроіве бясконцым.
А світальны золак зноў гарыць
Светлаю і ўдзячнаю самотай.
І ўзіраюць з вечнасці сябры
Як мы віцiраем слёзы ўпотай.

***

Жанчыны неспазнаныя заўжды,
Яны, відаць, і самі знаюць гэта.
Яны як неадкрытыя планеты,
Яны — як подых ветру малады.
Яны — пакуты, і яны — віна,
Яны — надзея, роспач і пяшчота.
Яны — і радасць, і сама самота,
Яны — атрута, што каўтнеш да дна.
Яны — і вынік, і жыцця выток,
Яны — страла, што ў нашы сэрцы
цэліць.
Яны — праменняў залаты клубок,
Што працінае свет праз ночы цемру.

КОЛА

Чатыры аповеды

Кірыл СТАСЕЛЬКА

КАЗА

Аднойчы Стасюк захварэў. Ягоныя косткі заблыталіся ў вузлы, зубы, нібы бразготкі, адстуквалі нейкі рытм, а змяіная скура грэла цела. І нават узімку ўначы ён быў гарачэйшы за печ. І тады сын падараваў Стасюку драўляную фігурку казы, якую выразаў сам, і сказаў, што яна дапаможа. Але пасля гэтага яе ў знак падзякі трэба перадаць камусьці іншаму.

Наступным днём лекар з суседняга мястэчка падахвоціўся ацаліць Стасюка, якога хвароба ўжо амаль дарэшты ўзяла ў свае моцныя абдымкі. Малады лекар быў высокі, далікатны целам, але дужы думкамі. Яго вочы ўпрыгожвала шкло, а рукі казытаў час. Хутка Стасюк скінуў змяіную скуру, а лекару, які не ўзяў плату, падараваў фігурку казы.

Праз сотню дзён лекара запрасіў на службу князь — дзяцюк сярэдняга росту, з вялікім пузам і доўгімі вусамі, якія ён закладваў за вушы. Князь быў такі вясёлы, што ягоны рогат смяшыў нават тых, хто быў у жалобе. Яго дабрыня асвятляла ноч. Яго адкрытасць расчыняла дзверы. А сярод багацціяў князя мелася мноства палацаў, залатых статуй і карцін. Было ў яго таксама шмат дзяцей. Неўзабаве князь адправіў лекара па веды ў горад, у якім знайшоў прыстанак апостал, што нарадзіўся на світанні. У знак падзякі лекар аддаў яму фігурку казы.

А князь падараваў казу мастаку, які распісаў у палацы дзве залы. Унутры ў мастака раслі кветкі, а рука адным узмахам нараджала цуды. Таму казе ў яго было асабліва добра. Мастак умеў ствараць новыя сусветы і копіі людзей. Бывала, пяройдзеш з адной залы з яго роспісам у наступную — нібыта ў іншы сусвет патрапіш. Здаралася, паглядзіць маці на сына і на яго копію, створаную мастаком, а зразумець, дзе хто — не можа. Аднойчы жонка падклала мужу сваю копію рукі майстра. Пакуль муж здагадаўся, жонка ўжо далёка збегла з іншым.

Мастак падараваў казу кухарцы князя, якая пазіравала для яго сем начэй. Жанчына цешыла свайго гаспадара рэдкімі стравамі, рэцэпты якіх ведала толькі яна. Гатавала яна вельмі смачна, аж госці часам забываліся пра ўсё вакол і з імі можна было рабіць што заўгодна.

Кухарка падаравала драўляную казу сваёй сястры, якая падзялілася з ёй новым рэцэптам. Тая — жонцы свайго сына з нагоды нараджэння ўнука. Жонка сына падаравала казу свайму сыну — унуку сястры кухаркі. Хлопчык, калі падрос, абмяняў у сябра фігурку на пояс з прыгожымі ўзорамі.

Праз некалькі сотняў начэй і некалькі дзясяткаў восеней завітаў на Стасюковы двор жабрак — з кіем у руцэ, маленькай торбачкай, вялікім носам, заплюшчанымі вачыма і цяжкай галавой. Стасюк накарміў незнаёмца і пакінуў на ноч. Раніцай жабрака ўжо не было, але ён пакінуў у падзяку драўляную казу.

Фігурка моцна змянілася, але Стасюк усё роўна яе пазнаў. Князь уставіў у вачніцы два каштоўныя каменьчыкі, мастак упрыгожыў чароўным роспісам, а ад кухаркі каза атрымала ў спадчыну пахі самых вытанчаных страў, якімі можна было насалоджвацца не горш, чым водарамі прыроды.

Сын сказаў Стасюку, што каза прайшла кола, таму цяпер бацька можа пакінуць фігурку сабе і яна будзе служыць абярэгам.

КАМЕНЬ

Гэта быў адзін з чатырох камянёў, якія клалі перад будаўніцтвам дома, дзе жыў Мікалай.

Раней хата стаяла непадалёк ад горада жалезнага ваўка на землях, што некалі атрымаў Міхал ад гетмана з густой барадой. Наша сям'я доўга там жыла, пакуль Гаўруку незадоўга да прыходу нашчадкаў Олафа не прыснілася драўляная рыба. Ён разабраў дом, прадаў зямлю і з сям'ёй выправіўся шукаць новае месца.

Спыніўся ён праз тры дзясяткі дзясяткаў начэй каля ручая, на беразе якога ляжала драўляная рыба. Ручаёк паспешліва нёс сваю песню і ніколі не быў такі, як секунду дагэтуль. Сваім ён давяраў сакрэты. Пакаштуеш з яго вады — і яна раскажа, дзе была. Так можна было вярнуцца ў мінулае, але толькі не ў будучыню, бо туды вада і спяшалася. Такім чынам Гаўрук даведаўся, што рыба — таксама з горада ваўка. Ён апусціў яе на ваду, і драўляная рыба адправілася з раўчуком паказваць дарогу камусьці іншаму. Але Гаўрук не ведаў, каму, бо ручаёк яшчэ толькі спяшаўся ў заўтра.

Для дома Гаўрук адлічыў трыста крокаў ад ручая — па часе свайго шляху і паклаў знойдзеныя па дарозе чатыры камяні з чатырох палёў. Ноч памерла, а камяні засталіся: значыць, месца добрае. Ці то яны з жонкай стапталіся і скурчыліся, ці то вока стамілася, але новы будынак аказаўся амаль удвая большы. Зрэшты, гэта было дарэчы, бо хутка ў іх нарадзіліся тры сыны.

Першага Гаўрук аддзяліў ад маці самым вялікім камянём, які быў чырвонага колеру, цёплы, з мноствам расколін, і з іх вымалёўваўся абрыс мядзведзя. Другому сыну Гаўрук перабіў пупавіну меншым камянём, які быў авальнай формы, амаль як булава, і меў водар ягад. Малодшаму — самым маленькім, гладкім і са скразной дзірачкай. Тры гэтыя камяні ён аддаў сынам, а сабе пакінуў чацвёрты: бясколерны, няроўны, не самы вялікі, але і не самы маленькі, без глыбокіх расколін, але і не зусім гладкі.

Уначы Гаўрук клаў камень пад галаву, каб адганяць благія сны і рана ўставаць. Калі чуў гром, грыз яго, каб зубы не балелі. Збіраючыся куды-небудзь, клаў яго за пазуху, каб абараніцца ў дарозе. Пакідаў каля капусты, каб яна расла такой жа моцнай. Падкладваў сястры ў фартух, каб тая дала жыццё. Клаў пад хлеб, каб шанцавала.

...І яму пашанцавала. Праз тры зімы, пасля таго, як малодшы сын вырас, да дома каля ручая прыехала маладая князёўна з доўгімі, здушанымі пярсцёнкамі, пальцамі, з пышнымі грудзьмі, якія блыталі думкі. А яшчэ ў яе быў ласкавы позірк, мяккасць якога аблытвала і звонку, і знутры. Яна распавяла Гаўруку, што знайшла драўляную рыбу і што яе змайстраваў бацька князёўны, ужо нябожчык. Выпадкова згубленая рыба мела для дзяўчыны вялікую каштоўнасць. Ручай расказаў ёй (бо ён памятаў мінулае), што Гаўрук адпусціў драўляную рыбу далей і за гэта яна хацела б яму аддзячыць.

Князёўна пакінула столькі срэбра, што ім карыстаўся спачатку Гаўрук, потым ягоныя дзеці, пасля ўнукі, праўнукі, прапраўнукі, прапрапраўнукі і гэтак далей, пакуль падзяка не скончылася. Срэбра растала па шляху з пазаўчора ў паслязаўтра, а камень застаўся. Яго таксама перадавалі ад старэйшага да малодшага ў надзеі на новую ўдачу. Цяпер ён удвая меншы, чым быў, калі Гаўрук падабраў яго на адным з палёў.

КЛЮЧ

Суседняя вёска знаходзілася за рэчкай. Двароў там было няшмат, а дзяцей яшчэ менш. Самай малодшай дзяўчынкай была Куліна. Казалі, яна дрэнна расла таму, што рэдка грэлася на сонейку і яшчэ радзей патрапляла пад дождж. Дрэнным норавам альбо шкадлівасцю яна не вызначалася, але была надзвычай нязграбная. Мошка ў вока трапіць, дзяўчынка павекам лыпне — курыца знікне. Пацягнецца далонькай за адным яблыкам і выпадкова закране суседні — той зваліцца ў кошык і ўсе яйкі паб'е. Адкрые рот нешта сказаць — наб'ецца ў яго дыму ад вогнішча, чхне яна з усіх сіл, ператрасе яе з галавы да ног, посуд з паліцаў пазвальваецца і паразбіваецца на тысячы аскепкаў, якімі хто-небудзь абавязкова возьме і парэжацца.

А бацька Куліны вельмі не любіў, калі дзеці глупствам займаліся і хатнія рэчы псавалі. Таму часта караў дачку. За любую правіну саджаў яе ў пуню і зачыняў на ключ, які насіў у сябе на шыі, побач з матчыным вузлом. Замок гэты падараваў яму брат, а зрабіў яго адзін нетутэйшы майстар. Быў на гэтым ключы ўзор у выглядзе кветкі.

І ў зялёныя, і ў белыя дні, і раніцай, і ўвечары, а здаралася, і па начах Куліна сядзела ў пуні. Дзяўчынка замірала, як вясёлка, у цемры, каб ніводная пачвара яе не заўважыла. Яна дыхала павольна і вельмі ціха, каб нікога не разбудзіць, моцна заплюшчвала вочы, каб праз іх не прасачылася што-небудзь страшнае, і закрывала вушы, каб іх не казыталі рыпанне, тупат і шэпт.

Бацька караў яе і пазней, калі дзяўчынка ўжо вырасла ў дзяўчыну, а сам ён з мужыка вырас у дзеда. Каб дачка не скарысталася яго слабасцю і ў адплату таксама не замкнула ў пуні, бацька зняў з шыі ключ. Ён злавіў качку, прывязаў ключ да яе лапкі і адпусціў. Аднойчы качка зачапілася за хмызняк і яе знайшла Чэся — маці стрыечнай сястры маёй матулі. Яна вызваліла птушку, а ключ пакінула сабе як шчаслівы знак.

Ключ і напраўду быў шчаслівы, бо надзяляў гаючай сілай. Праз яго Чэся тройчы прапускала ваду дажджавую, ваду з ручая, возера, рэчкі і са студні. Яна маўчала, калі прапускала ваду праз ключ першы раз. Другі раз яна шаптала, трэці — напявала.

Праз колькі дзён і начэй да Чэсі прыйшла жанчына, якая папрасіла вылекаваць яе ад страшных сноў. Кожныя дзесяць начэй ёй снілася, што праз вочы ў яе запаўзае вужыны кароль і казыча языком жывот знутры да таго часу, пакуль пад нагамі не набяжыць лужына слёз. Чэся дастала ключ і вочы жанчыны праглынулі павекі. Чэся тройчы паліла кветку, што была на ключы, дажджавой вадой, вадой з ручая, возера, рэчкі, студні. Ноздры жанчыны зліпліся. Чэся памыла ёй твар і яна раптам застыла як вясёлка, а праз адзін удар сэрца павалілася на зямлю і больш не падымалася.

З тых часоў маці стрыечнай сястры маёй матулі адклала ключ убок і больш ніколі не прапускала праз яго ваду, бо баялася загубіць яшчэ некага. Але яна не ведала, што той жанчынай была Куліна, якую ўжо даўно загубіў бацька, а той ключ толькі адчыніў дзверы ў цемру.

ЦВІК

Гэты ржавы цвік мне параіла падабраць мая каханая. У нашай сям'і заўсёды было прынята слухаць жонку. Так заведзена яшчэ ад Сымона — сына Васіля, бацькі Міхала.

Аднойчы, на малады месяц, Сымон вяртаўся ад брата. Тры дні ён ішоў праз рэкі, лясы і палі, а на чацвёрты дзень згубіў цярпенне ў адной з вёсак, якая ляжала на шляху. Пачаў тады распытваць: можа, хто выпадкова знайшоў яго страту, але ні броварнік, ні гандляр, ні аптэкар, ні каваль, ні шаптуха, ні млынар, ні воін, ні распусніца, ні ксёндз, ні чорт, ні селянін, ні шляхціч, ні стары, ні малады, ні мужык, ні баба, ні свой, ні чужы, ні жывы, ні нябожчык — ніхто не знаходзіў яго цярпенне. Так і давялося яму без цярпення вярнуцца дахаты.

За што б ён ні браўся, нішто не давалася: ні праца, ні каханне, ні гора, ні радасць. Доўга мучыўся Сымон, аж пакуль на поўны месяц не сустрэў незнаёмца. Быў той закручаны ў тканіну колеру акацыі, а ў руках трымаў лядвенец. Вочы яго зацягвалі ў сябе пустэчай, як камплімент ліслiўца, вейкі былі грубыя, як ласкі батага. Сымон абмінуў бы яго і тры разы плюнуў бы цераз плячо, але незнаёмец раптам прапанаваў вярнуць яму цярпенне. Для гэтага, сказаў ён Сымону, трэба за тры дні да старога месяца прынесці на лысую гару самае дарагое, што ў яго ёсць, пакласці на зямлю, патаптаць нагамі, затым падпаліць, і прыгаворваць што-небудзь вельмі гідкае і брыдкае, пакуль не дагарыць. Зрабіць усё гэта варта так, каб ніводная жывая душа не ўбачыла.

Нічога каштоўнага не меў Сымон, толькі касу жонкі сваёй вельмі любіў. Яна была густая, як ноч у лесе, мяккая, як пагляд дачкі, доўгая, як піск камара. Яна пахла дваццаццю відамі кветак, што раслі на пятнаццаці пагорках, дзевяццю відамі садавіны, што збіралі пяць дачок князя, трыма відамі траў, што раслі каля аднаго валуна. Як жонка была спакойная — валасы збіраліся ў касу, калі злавалася — валасы збіраліся ў пучок на патыліцы, калі сумавала — то звісалі да долу. Як кахалася — то абвівала імі мужа. Так, гэта, бадай, было самае дарагое ў яго.

Выбару не было, і, як наступіў трэці дзень перад старым месяцам, узяў Сымон тройчы пакроплены святой вадой серп і, пакуль жонка спала, зрэзаў яе касу. А як зрэзаў, зоркі пагаслі, а ноч зашумела. Але зрабіў Сымон усё так, як яму загадаў незнаёмец. Бо вельмі яму хацелася вярнуць цярпенне.

А як прачнулася жонка і выявіла, што страціла касу, то раскрыла яму сваю таямніцу. У валасах, якія яна гадавала ад нараджэння і якія ніколі не зразала, мелася гаючая сіла. Такімі былі ўсе дзяўчаты, чые дзевяць пакаленняў продкаў займаліся цырульніцтвам і хто нарадзіўся ў перыяд, калі сястра месяца, названая ў гонар багіні кахання, праходзіць між намі і братам Эос. Пазбавіўшыся касы, пазбавілася і моцы сваёй. А незнаёмцам тым быў сын суседзяў яе бацькоў, якому дзяўчына падабалася яшчэ з маленства. А як не дасталася яму, то зрабіў, каб не дасталася нікому.

Гэтак па сваёй віне Сымон страціў маці сваіх дзяцей. Цярпенне і каханне да яго так ніколі і не вярнуліся, а радасць толькі зрэдку наведвала — калі сын Міхал граў на трашчотках.

З тых часоў у нашай сям'і перш, чым нешта зрабіць, заўсёды да жонкі, маці ці сястры ідуць.

знаны госць

Этнамузыколаг Тамара ВАРФАЛАМЕЕВА:

«Не трэба ўсю моладзь прымушаць любіць традыцыйную культуру»

«Са столі звісае павуцінне, як фіранка з акна, а на ім — агромністыя павукі сядзяць! Нідзе больш такіх не бачыла… Мне даводзілася тануць у Заходняй Дзвіне, уцякаць ад пераследнікаў праз лес…» Здаецца, гэта ўспаміны галівудскай актрысы пра здымкі ў трылеры. Але не. Гэта толькі некаторыя згадкі з палявой працы вядомага этнамузыколага, кандыдата мастацтвазнаўства Тамары Варфаламеевай. Не так даўно Тамара Барысаўна адзначыла 75-годдзе. З гэтай выдатнай нагоды даследчыца падзялілася ўспамінамі пра былыя вандроўкі, паразважала пра розніцу даследчыцкіх пакаленняў і адказала на пытанне, чаму сучасныя спявачкі не змогуць мець такія ж галасы, як мелі нашы продкі.

Пра розніцу пакаленняў

— Падаецца, што відавочнай розніцы паміж намі ўсё ж няма. Справа ў тым, што этнамузыколаг — спецыяльнасць настолькі рэдкая, што прадстаўнікоў нашай прафесіі на Беларусі заўсёды налічвалася хіба менш як дзясятак. Такая эксклюзіўнасць дазваляе перазнаёміцца паміж сабой, мы адно аднаго добра ведаем: старэйшае пакаленне — маладзейшых, маладзейшыя — нас, і па магчымасці дзелімся досведам. Магчыма, розніца паміж намі хіба што ў тых тэхнічных сродках, што некалі выкарыстоўвалі мы, і якімі карыстаюцца маладыя. А менавіта тэхніка этнамузыколагу сёння моцна дапамагае, напрыклад, для картаграфавання напеваў. Напеў для нас — гэта не проста мелодыя, гэта сістэма спецыяльных знакаў, якія шмат пра што распавядаюць, якія трэба вывучаць, бо яны — і крыніца ведаў, і матэрыял для вывучэння. Натуральна, перадаём маладым досвед палявой працы.

Што тычыцца нашага пакалення, магу адзначыць, што мы амаль не мелі тэхнічнай магчымасці шмат і доўга знаходзіцца ў экспедыцыях, бо карысталіся ў асноўным грамадскім транспартам. Сёння многія даследчыкі маюць уласныя аўтамабілі, гэта, натуральна, больш зручна, камфортна і бяспечна для самога этнамузыколага. Тым не менш я з настальгіяй згадваю, як спала на сенавале. Памятаю адну з экспедыцый з маім кіраўніком Зінаідай Мажэйкай, калі мы залезлі на сенавал і пабачылі велізарных павукоў! Страху не было, хутчэй здзіўленне, настолькі яны вялікія! Тады падумала толькі — вось, дзе трэба здымаць фільм пра Вія.

Экспедыцыі я сёння ўспамінаю не толькі як першы этап даследавання, але і як частку свайго жыцця, жыцця незвычайнага. Калі не чакаць нечаканасцяў у вандроўцы, то іх не будзе *(Смяецца.)*.

Пра дзень сённяшні

— Недахопы былі, ёсць і будуць заўсёды. Тым больш што народная культура — тая частка нашай агульнай культуры, якую трэба абараняць. Як прадстаўнік старэйшага пакалення даследчыкаў перажываю за сапраўдныя праявы аўтэнтыкі, якія і сёння — на дзіва — існуюць у вёсках. Тут гаворка пра экалогію традыцыйнай культуры ў цэлым і музычнай культуры ў прыватнасці. Яна ніколі з задач дня не сыдзе. Маладыя навукоўцы таксама клапоцяцца пра тое, каб гэты від творчасці не знік, але, падаецца, больш спакойна, чым мы некалі. Раней увесь час імкнуліся выступаць на канферэнцыях, стараліся «варушыць» чыноўнікаў. А сёння хіба толькі самім фактам пазітыўнага стаўлення да народнай культуры даводзім, што гэта асаблівы пласт спадчыны, у многім незвычайны, бо незразумелы гораду. Але гаворка пра багацце, што беларусы зрабілі сваёй этнічнай адметнасцю. У плане этнічнасці мы пераўзышлі многія народы. Магчыма, таму і сёння да нас у фальклорныя экспедыцыі прыязджаюць навукоўцы з Санкт-Пецярбурга, Масквы, Польшчы, краін Балтыі і абавязкова нешта адметнае тут знаходзяць.

Пра прычыны захаванння спадчыны

— Я падзяляю погляды выдатнага філосафа Уладзіміра Конана. Ён пісаў пра так званую «адсталасць» беларусаў. За ўсе гады сваёй палявой працы зразумела, што па сваёй ментальнасці беларусы звернуты да традыцыі. Горад — месца, дзе ўсё кіпіць і ўвесь час змяняецца. А вёска і дагэтуль імкнецца да ўстойлівасці, спакою, традыцыі. Я гэта назвала б станоўчым кансерватызмам. Беларусы хочуць памятаць сваё і жыць тым, чаму яны навучыліся ад бацькоў.

Але жыццё не супыніць, таму тыя ж самыя бабулі хочуць, каб іх дзеці і ўнукі ехалі ў горад, атрымлівалі адукацыю і вярталіся на радзіму пісьменнымі. Гэта адна з прычын, чаму ў рэгіёнах застаецца мала людзей, каму можна перадаваць традыцыі. Існуе і цалкам супрацьлеглы рух: у гарадах з'яўляюцца людзі, якія разумеюць каштоўнасць традыцыйнай сістэмы, прынамсі для выхавання новага пакалення і захавання беларускасці. Таму цяпер менавіта ў гарадах арганізоўваюцца фальклорныя рухі, якія зыходзяць не столькі ад натуральнай пераемнасці ў сям'і, колькі ад свядомага разумення сувязі пакаленняў.

Пра натуральнасць такой беларускасці

— Возьмем два прыклады: Міколы Козенкі і Ларысы Рыжковай. Мікола Аляксеевіч — паляшук, але ў дзяцінстве, жывучы ў Мазыры, непасрэдна не меў асабістага вопыту стасункаў з народнай культурай, каб быць самому яе носьбітам. Але гэты чалавек — з тых самых «вар'ятаў», які паставіў мэтай жыцця даводзіць беларусам сваю этнічнасць праз асобныя праявы культуры. Напрыклад, калі ён быў адным з кіраўнікоў мастацкай дэлегацыі Беларусі на Алімпійскіх гульнях у Маскве ў 1980-м, то заўважыў, што толькі беларусы, прадстаўляючы сваю краіну, маглі заспяваць хіба што «Касіў Ясь канюшыну». Ды і нашай мовы ніхто не ведаў. Гэта яго настолькі ўразіла, што Мікола Аляксеевіч пачаў размаўляць па-беларуску, а потым і ўсю працу скіраваў на тое, каб развіваць і захоўваць нашу спадчыну. Сёння ён — выдатны этнахарэолаг, больш як 20 гадоў працуе з дзецьмі у Мётчанскай школе Барысаўскага раёна. Навучыў больш як сотню дзяцей спяваць, танчыць, выразаць выцінанкі, рабіць паясы. Так, народная культура стала часткай жыцця маладых людзей. Заснаваў і фестываль «Берагіня», які ператварыўся ў сапраўдны рух.

Іншы прыклад — знакаміты калектыў «Калыханка» Ларысы Рыжковай. Ларыса Мікалаеўна сама мае прафесійную акцёрскую, рэжысёрскую адукацыю. Яна зразумела, што сістэма Станіслаўскага можа быць вельмі ўдалая, куб вучыць дзяцей традыцыйнай культуры. Такіх людзей можна прыгадваць многа. Яны працуюць у розных мясцінах краіны і маюць вынікі.

Пра неабходнасць выхавання ў традыцыі

— Я абсалютна ўпэўненая ў тым, што не трэба ўсю моладзь прымушаць любіць традыцыйную культуру. Таксама як немагчыма ўсіх прымусіць любіць балет ці оперу. Калі ў душы ёсць струны, што могуць адгукнуцца на мелодыі, гучанне, рухі, то сам чалавек будзе гэтым займацца, і таму ёсць выдатныя прыклады. Ніякія афіцыйныя ўстановы, кіраўнікі тут ні пры чым, бо пачынаюць працаваць прынцыпы пераймання.

Пра будучыню

— Аўтэнтыка памірае, бо памірае замкнёнае асяроддзе, ва ўмовах якога яна можа існаваць у рэжыме самарэгуляцыі. Яна ж апрыёры існуе ў рэжыме самарэгуляцыі. Калі XX ст. гэтае закрытае грамадства разамкнула, то аўтэнтычныя праявы традыцыйна культуры пачалі знікаць, прынцыпы гарадско культуры — пераносяцца на вясковую, выцясняць яе. Узнікла праблема абароны першакрыніцы. Таму, падаецца, што і праз некалькі дзесяцігоддзяў усё будзе прыкладна так, як мы назіраем сёння. Хочацца толькі, каб афіцыйная культура падтрымлівала выселкі навукоўцаў і прыслухоўвалася да іх прафесійных парад.

Пра сцэнічнае ўвасабленне фальклору

— Калі танец пераносіцца на сцэну, то яго новае ўвасабленне не такое разбуральнае для аўтэнтычнай формы. Але калі, напрыклад, жніўную песню перавесці ў сцэнічны фармат, то ад яе застаецца толькі гук, гучанне. Большасць аўтэнтычных формаў фальклору становяцца другаснымі, таму паўстае пытанне якасці гэтых новых пераўвасабленняў: яны могуць быць набліжаныя да арыгінала ці цалкам перапрацаваныя. Які варыянт выбраць?

Пра новыя трэнды ў выкарыстанні элементаў традыцыйнай культуры

— Калі вам будзе столькі гадоў, колькі мне, вы гэта ўсё: і татуіроўкі з арнаментам, і вышымайкі — будзеце любіць і не будзеце прымаць новае, што пойдзе за гэтымі з'явамі. А нешта новае абавязкова будзе. Мне як чалавеку, які ўжо пажыў, гэтыя з'явы падаюцца глупствам *(Смяецца.)*. Гэта другасныя сімвалы, гульня. Калі ты адзеў вышыванку — абсалютна не азначае, што ты беларус. Так не бывае. Галоўнае — веды і свядомасць. Кожнае пакаленне нясе сваё, але галоўнае — не забывацца на глыбінныя плыні. Проста даніна модзе адразу становіцца гульнёй.

Я веру ў беларусаў, якія жывуць беларускасцю. Яна можа выяўляцца па-рознаму, часам нават нечакана, але галоўнае, каб яна была. Ёсць магчымасць зберагчы эстэтычныя вартасці песні, існуе мноства запісаў. Засталіся арыгіналы гучання, і іх можна пераняць. Зразумела, што яны непаўторныя, але хаця б праз іх дапамогу ёсць магчымасць для наступнікаў не забыцца на мелодыі, словы, лірыку, мову. Многія ж пасланні перадаюцца праз інтанацыю.

Пра голас, танец «аўтэнтычны» і «малады»

— Варта радавацца, што вакол традыцыйнай культуры існуюць групы людзей, якія прытрымліваюцца розных пунктаў гледжання. Нехта прапагандуе танец «не адрываючы ног ад падлогі», а нехта скача гарэзліва. І яны могуць паміж сабой спрачацца, аргументаваць свае меркаванні. Гэта прыкметы справы жывой, не мёртвай. Што да мяне, то лічу, што малады чалавек не можа і не павінен танцаваць, як стары. Гэта ненатуральна.

У спевах важна пераняць манеру выканання, дабіцца тэмбравага гучання і большай набліжанасці да аўтэнтыкі. Але трэба разумець, што гукавыманне выхоўваецца ў вёсцы на адкрытым паветры. Хіба я магу дакрычацца да дачкі з 8 паверха? А ў вёсцы крыкам «Ганна!», маючы адпаведны вопыт, можна пагаварыць з сяброўкай на адлегласці ў некалькі дамоў. Галасавы апарат выхоўваецца на адкрытым паветры, ён так жа працуе і ў спевах. У гарадскім асяроддзі настолькі моцна, з такімі магчымасцямі яго нельга распрацаваць.

Тым не менш гарадская моладзь мае права спяваць па-свойму. Галоўнае — быць беларусам у душы, а спяваць лепш — пераняўшчы нейкую традыцыю. Потым яе распаўсюджваць. Варта ўлічваць, разам з тым, традыцыю якой вёскі, якога рэгіёна, ты паказваеш. Не існуе агульнага беларускага спеўнага стылю. Таму варта паказваць і захоўваць менавіта лакальныя спеўныя, танцавальныя традыцыі, яны пакажуць нашу разнастайнасць.

Вёска спявае і танцуе па-свойму, горад — па-свойму. Важна, каб яны спявалі і танчылі ды не палохаліся адно аднога. Каб маладыя не палохаліся слова «Качан» ці прапаноў скакаць «Мікіту», «Барыню» ды «Жабку», каб гэтыя словы не былі для іх незразумеласцю, а звычайнай назвай танца, які яны лёгка змогуць выканаць. Наша моладзь, якая ведае свае карані, павінна быць моладдзю.

Марына ВЕСЯЛУХА

векапомнае

Дзоты мужнасці

Падчас святкавання сёлетняга Дня Перамогі на беразе Дняпроўска-Бугскага канала непадалёк ад вёскі Белін, што на Драгічыншчыне, быў урачыста адкрыты памятны знак — валун з інфармацыйнай плітой як даніна мужнасці беларускіх партызан.

Менавіта тут 75 гадоў таму праходзіла партызанская лінія абароны. Баявыя дзеянні партызан у паўднёвай частцы Брэсцкай вобласці непадалёк ад граніцы з Украінай у лютым — сакавіку 1944 года ўвайшлі у гісторыю партызанскага руху Беларусі як «40-дзённая абарона Дняпроўска-Бугскага канала».

…На пачатку лютага 44-га Чырвоная Армія вызваліла ўкраінскія гарады Роўна, Луцк і пачала цяжкія баі за Ковель. Войскі 70-й арміі перайшлі Прыпяць і рухаліся ў напрамку Дзівіна і Макран, набліжаючыся да Брэста. Яны маглі зайсці ў тыл 2-й нямецкай арміі, перарэзаць для ворага чыгунку і шашу Брэст — Пінск. Перакінуўшы сюды войскі з другіх участкаў, немцы здолелі спыніць наступленне савецкіх войск.

Тэрыторыю паміж Дняпроўска-Бугскім каналам і левым берагам Прыпяці займалі партызаны Пінскага і Брэсцкага злучэнняў. У вёсцы Сварынь дзейнічаў партызанскі аэрадром, куды дастаўляліся боепрыпасы, медыкаменты і газеты, а назад самалёты вывозілі раненых і хворых. Тым часам партызаны наносілі ворагу цяжкія страты.

Але партызаны змаглі падрыхтавацца да абароны загадзя, бо разведка інфармавала: немцы рыхтуюцца да наступлення. Да сярэдзіны лютага з дапамогай мясцовых жыхароў пабудавалі лінію абароны на паўднёвым беразе канала, які ў 1943 годзе народныя мсціўцы вывелі са строю, але ён усё роўна заставаўся натуральнай перашкодай для ворага.

У наступленне супраць партызан немцы кінулі корпус групы войск «Агрыкола», у складзе якога была 23-я венгерская пяхотная дывізія. Атрад імя Калініна брыгады імя Молатава заняў абарону ў раёне дарогі Белін — Мукашын, на пераправе каля спаленага моста. Там было тры дзоты. Партызанская вайна прыняла тут формы сапраўднага фронту, з уласцівымі яму элементамі — дзотамі і акопамі. Пасля артылерыйскай падрыхтоўкі і мінамётнага агню вораг пачаў наступленне. Асноўныя баі адбыліся 22 лютага. Атакі венграў працягваліся цэлы дзень. Праціўнік падцягнуў да канала гарматы і стаў біць па партызанскіх пазіцыях. Ад прамога пападання снарадаў дзоты былі разбураны. Народныя мсціўцы панеслі страты...

Нямецкае камандаванне вырашыла нанесці ўдар цераз партызанскую зону, адсекчы і акружыць савецкія войскі. Адначасова ставілася задача ачысціць ад партызан гэтую тэрыторыю, знішчыць аэрадром і замацавацца на Прыпяці.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваюцца партызанскія і нямецкія дакументы, які сведчаць пра тыя баі. У дакладной камандзіра брыгады імя Молатава М. Герасімава пазначана, што палкі венграў, маючы перавагу ў жывой сіле і тэхніцы, дзвюма калонамі 21 лютага падышлі да Дняпроўска-Бугскага канала ў раёне вёсак Белін і Зарэчка… Шлях праціўніку заступаў канал і наша абарончая лінія. Бой за пераправу на гэтых участках працягваўся трое сутак, абяскроўлены праціўнік адкаціўся назад...

Заўсёды цікава паглядзець на гэтыя ж падзеі з процілеглага боку. Камандуючы ахоўнымі войскамі паведамляў: «Венгерская баявая група пасля падаўлення некалькіх бандыцкіх дзотаў і жорсткага супраціўлення праціўніка заняла масты праз канал Крулеўскага каля вёсак Зарэчка і Белін, 15 км паўднёвей Драгічына. Уласныя страты: 1 фенрых і 5 гонведаў забіта, 2 фенрыхі і 29 гонведаў паранена» (фенрых, верагодна, афіцэр, гонвед — салдат. — **Аўтар**). Назву Каралеўскі (Крулеўскі) канал атрымаў з-за таго, што будаваўся пры кіраванні апошняга караля Польшчы Станіслава Панятоўскага.

Пасля захопу перапраў на канале венгры не сталі наступаць далей на партызанскую зону. Праўда, баі мясцовага значэння працягваліся да канца сакавіка. Мадзьяры праводзілі разведку і чакалі падмацаванне. У канцы сакавіка на станцыях Драгічын і Іванава выгрузілася нямецкая дывізія. Немцы зрабілі пераправу і пачалі наступленне на партызан у напрамку Прыпяці. Брыгада імя Молатава мужна трымала абарону. Калі паўстала пагроза акружэння з-за адыходу суседняй Пінскай брыгады на правым флангу абароны канала, камбрыг Герасімаў загадаў адыходзіць. Пасля абарончых баёў 30 сакавіка партызаны перайшлі на ўкраінскую тэрыторыю і злучылася з савецкімі войскамі. Да вызвалення Беларусі заставаліся лічаныя месяцы.

Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ,
фота аўтара

Падчас адкрыцця помніка.

У АДКРЫТЫМ ДОСТУПЕ

Гістарычная памяць паводле Сяргея Новікава

У залаты фонд айчыннай гістарычнай навукі даўно ўвайшлі даследаванні кандыдата гістарычных навук, дацэнта Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Сяргея Новікава па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. У работах навукоўца, які нядаўна адзначыў юбілей, ёсць і нестандартнасць у фармуляванні навуковай праблемы, грунтоўная аналітыка, майстэрскія абагульненні фактаў, уменне структураваць навуковую працу. Сяргей Новікаў шмат працуе ў беларускіх архівах. Дапамаглі справе навуковыя стажыроўкі ў Германіі, вынікам якіх з'яўляюцца здабытыя ўнікальныя дакументы.

Дзякуючы Сяргею Новікаву зроблены важныя ўдакладненні па гісторыі мінскага гета. У Інстытуце сучаснай гісторыі ў Мюнхене ён першым сярод даследчыкаў угледзеў дзённікавыя запісы берлінскіх яўрэяў М. Крон і Б. Руднера пра знаходжанне ў мінскім гета. Там жа трапіла ў рукі выніковая справаздача аб дзейнасці эканамічнага штаба Ост на акупаванай савецкай тэрыторыі, у тым ліку ў Беларусі. Гэтую знаходку навуковец выкарыстаў у манаграфіі «Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў».

У часопісе «Беларуская думка» ў № 5 за 2010 год быў надрукаваны артыкул Сяргея Яўгенавіча «Абарона Брэсцкай крэпасці летам 1941 года ў ацэнцы гістарыяграфіі і ў святле дакументаў», дзе на цэнтральным месцы — данясенне камандзіра 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі «Аб баявых дзеяннях у ходзе ўзяцця Брэст-Літоўска». Поўны тэкст гэтага дакумента навуковец знайшоў у Федэральным ваенным архіве (г. Фрайбург). Паводле данясення, амаль на кожным участку наступлення германскія часці сустрэлі эфектыўную агнявую абарону. Разам з тым з дакумента вынікае: з 23 чэрвеня немцы захапілі ў палон шмат абаронцаў крэпасці, агульная колькасць якіх праз 9 дзён баявых дзеянняў значна вырасла ў параўнанні з першай групай чырвонаармейцаў, якія трапілі ў палон вечарам 23 чэрвеня. Тады, пачынаючы з 18.30, на ўчастку наступлення 135-га пяхотнага палка (паўночны востраў) здалося ў палон прыкладна 1900 абаронцаў.

На трэці дзень абароны крэпасці 2-і батальён 133-га нямецкага пяхотнага палка заняў паўднёвы востраў, захапіўшы ў палон 1250 савецкіх абаронцаў. Як паведамляецца ў данясенні, у апошні дзень нямецкага штурму 29 чэрвеня ў палон трапілі 389 чырвонаармейцаў. Пры гэтым вечарам 28 чэрвеня на тэрыторыі крэпасці немцамі былі выяўлены «амаль 2000 забітых рускіх». Вось яшчэ адна з трагічных старонак гісторыі Брэсцкай крэпасці, якая ўсё яшчэ застаецца белай плямай у айчыннай гістарыяграфіі.

Данясенне пацвярджае і тое, што мы ведаем з даследаванняў беларускіх навукоўцаў: на сваім шляху часці германскага вермахта з самага пачатку агрэсіі супраць СССР сустрэлі моцны рубеж супраціўлення, на якім мужна стаялі савецкія воіны розных нацыянальнасцей.

На рахунку Сяргея Новікава амаль 340 навуковых публікацый: асабістыя манаграфіі, суаўтарства ў калектыўных даследаваннях, артыкулы, рэцэнзіі... Сяргей Яўгенавіч — адзін з ключавых аўтараў вучэбнага выдання 2004, 2005 і 2009 гадоў па спецкурсе «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» для школ і ўніверсітэтаў. Гэтае выданне карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод студэнтаў.

Навукоўца ўжо шмат гадоў па ўласнай ініцыятыве праводзіць бясплатныя экскурсіі на месцы лагера смерці Трасцянец. Пры гэтым выкарыстоўвае ўласныя напрацоўкі.

Міхаіл СТРАЛЕЦ

Зоя ЛУЦЭВІЧ: «МАСТАК НЕ МОЖА БЕЗ ФАНТАЗІІ»

Арт-галерэя пад адкрытым небам, што восьмы раз ладзіцца ў Мінску на плошчы Якуба Коласа ў рамках праекта «Мастак і горад», сёлета прысвечана творчасці дзвюх беларускіх мастачак — Зоі Літвінавай і Зоі Луцэвіч. У сярэдзіне ліпеня экспазіцыя мяняецца, творы Зоі Літвінавай саступаюць месца выстаўцы «Перакуленая рэчаіснасць» Зоі Луцэвіч. Адначасова ў Мінску праходзіць і іншы паказ твораў Зоі Луцэвіч — Alta Moda Zoya, дзе злучаюцца выяўленчае мастацтва і высокая мода, праект адкрыўся напрыканцы чэрвеня ў мемарыяльным музеі-майстэрні З. Азгура. Дарэчы, менавіта музей Азгура курыруе і галерэю «Зоі» на мінскай плошчы Якуба Коласа. А на пачатку года вялікі розгалас атрымала выстаўка «Сям'я», якую Зоя Луцэвіч прысвяціла сваёй зорнай сям'і мастакоў — Сяргею і Святлане Катковым, Алегу Луцэвічу, Зоі Літвінавай… Пра абедзвюх Зой цяпер і многа гавораць. Звязваюць мастачак адносіны настаўніка і вучаніцы, хроснай маці і хрэсніцы, людзей блізкіх і па жыцці, і ў мастацтве. З Зояй Луцэвіч гаворым пра выстаўкі, пра творчыя радасці і пакуты:

— Хачу найперш выказаць падзяку цудоўным людзям з музея Азгура, якія далі мне магчымасць паказаць свае карціны. Работы мы адбіралі разам і не аб'ядноўвалі адзінай канцэпцыяй ці тэмай: проста тое, што мяне добра характарызуе, — з розных перыядаў, у розных тэхніках, з розных матэрыялаў, там ёсць і графіка, і жывапіс, і калажы. Хоць я, канешне, не рэаліст, не натураліст, але сюжэты даволі зразумелыя, а карціны досыць яркія, каб прыцягнуць увагу ў тым ліку і выпадковых мінакоў. Большасць мастакоў прытрымліваюцца нейкага аднаго абранага кірунку, напрыклад, толькі жывапіс алеем. А я магу ўсё змешваць. Мяне заўсёды вельмі вабілі калажы, бо па сутнасці я мадэрніст, мне падабаецца збіраць мазаікі з усяго на свеце, сумна рабіць заўсёды аднолькава. Варта было мне і тут павучыцца, і на Захадзе, многае пабачыць, каб стаць рознабаковай. Бо мала ведаць толькі адну мову, ісці па лініі — я імкнуся быць, так бы мовіць, «шарам».

— З некаторага часу традыцыйныя жывапісцы, падобна, застаюцца ў ценю...

— А вось мне здаецца, што зараз, наадварот, вяртаецца цікавасць да чагосьці нармальнага пасля шматлікага ненармальнага. Не тое, што ненармальнага — дзіўнага, канцэптуальнага. Напрыклад, ты прыходзіш у музей, бачыш гіру — а насамрэч гэта не гіра, а зямны шар, абцяжараны дэпрэсіўнымі і дэструктыўнымі справамі чалавека. І як да гэтага ставіцца — незразумела, бо ты ўсё роўна бачыш толькі гіру, хоць тэкст за ёй — каласальны. Аднак жывапіс — гэта не літаратура. Мне падаецца, што гаварыць пра намаляванае ці створанае трэба меней, чым уласна маляваць. Я не расхвальваю Захад і сучаснае заходняе мастацтва. Зараз паўсюль нейкае зацішша, паўза, бязладдзе. І там не вельмі цікава, і тут нецікава. Мабыць, нешта адно заканчваецца, і хутка народзіцца іншае — новае і глабальнае. Каб толькі яго здолелі своечасова заўважыць.

Я адчуваю, што людзі зараз хочуць бачыць нешта душэўнае, не з халоднага розуму ўзятае. З гэтым, канешне, можна спрачацца, для чаго мастацтва — для прыгажосці, для праўды? Усё ж мастак павінен узвышацца над будзённасцю, а прыгажосць — гэта нармальна, гэта не ёсць пошласць, гэта не ёсць кітч. Іншая справа, для каго што прыгожа, хто і наколькі здольны разумець мастацтва. Але калі атрымліваецца шэдэўр, калі адкрываецца нейкая сапраўдная ісціна, то гэта ўсім зразумела. Хоць і не заўсёды адразу.

— А ў вас ёсць «прыгожыя» ў такім сэнсе карціны?

— Думаю, ёсць, хаця сама я не магу быць аб'ектыўнай. Проста даводзілася бачыць рэакцыі людзей, якія раптам пачыналі плакаць перад карцінамі, ці сагравaліся побач з імі. Быў нават выпадак, калі зімою наглядчыца музея сядзела ўвесь час не там, дзе грэлі батарэі, а каля маёй карціны, казала, што тут ёй больш цёпла. І я проста шчаслівая, калі людзі кажуць, што ў нейкія цяжкія дэпрэсіўныя моманты мае работы падтрымліваюць у іх дух. Маўляў, зірнеш на тваю карціну як на сонечнае святло — і можна жыць далей.

— Наколькі мастаку, каб быць паспяховым, важна прыдумваць канцэпцыі, многа гаварыць, а не толькі маляваць?

— Усё гэта дзеля грошай. А бываюць жа мастакі гранічна таленавітыя і сумленныя. Як Джорджа Марандзі, напрыклад, што не выходзіў са сваёй майстэрні, маляваў практычна адны нацюрморты і абсалютна не клапаціўся ні пра што іншае — думаў адно пра гармонію! Але ж вось гэта і ёсць самае складанае, калі і грошай хочацца, і гармоніі *(Смяецца.)*! Як знайсці гэты баланс, каб не ўпасці занадта нізка? Я, дапусцім, дакладна ведаю, якія карціны людзі хочуць бачыць, але, на жаль, да мастацтва іх пажаданні не маюць ніякага дачынення, бо густ не выхаваны. Пагадзіцеся, фраза, якую найчасцей даводзіцца чуць, як толькі заходзіць гаворка пра жывапіснае мастацтва — «Ой, я ў гэтым нічога не разумею!»

— Але вас у творчасці смела можна назваць крэатыўнай: чаго вы толькі не прыдумваеце акрамя традыцыйных карцін на палатне…

— Якраз перад нашай сустрэчай я думала, з чаго ж пачынаецца мастак, што самае важнае? І дадумалася, што мастак не можа быць без фантазіі, без выкручвання сабе мазгоў, інакш ён просты рамеснік, маляр. Я ўвесь час фантазірую: мне сняцца сны — і потым я нешта з іх згадваю, шмат за чым назіраю — і спрабую перайначыць. Нават кнігі, здараецца, гляджу дагары нагамі, каб убачыць нешта цікавае, каб правесці над сабой эксперымент, парадавацца нечаканаму выніку.

— Заўважна, што вы не баіцеся яскравых колераў. Напрыклад, любіце сіні, і хоць адной рысачкай ды абавязкова дадзіце ў карціну нешта нечаканае.

— Правільна. Кажуць, што беларускасці ўва мне не хапае *(Смяецца.)*. Але ж мастак — не для суму. Проста нехта можа сабе дазволіць быць шчырым і нават нахабным, а нехта — не. Мой настаўнік Зоя Літвінава мне заўсёды казала: «Вельмі складана пачынаць пісаць усёй палітрай. Колераў жа не сем — іх безліч. А ты, каб не заблукаць, вазьмі за аснову некалькі ўзаемаадносін, напрыклад цёплае — халоднае ці нешта іншае». І тады вось так працуеш у гаме «чорная — охра» і раптам дадаеш кавалачак ярка-сіняга ці чырвонага — і ўсё пачынае палаць! Калі я бядую, маю дрэнны настрой, то пішу нешта яркае, калі ўсё добра і спакойна — раблю нешта спакойнае, бо тады мне не трэба бадзёрыцца, распальваць сябе. Часам жартую, што ў беларускіх мастакоў, мабыць, толькі добры настрой, таму што ў іх усё так мякка. А я заўсёды ў дынаміцы.

— Вы маеце вопыт вучобы ў мастацкай акадэміі ў Мінску і ў Дзюсельдорфе. Ды й увогуле нямала працуеце на Захадзе, у Аўстрыі. Можаце неяк параўнаць гэтыя дзве сістэмы падрыхтоўкі мастакоў?

— Хоць мяне і выключылі з мінскай акадэміі, я не хачу яе пляжыць. У тыя часы вучыліся (не ведаю, як зараз) на рускім мастацтве, але ж беларускае адрозніваецца ад рускага. Калі бываюць вынікі? Калі ў справу ўкладаюцца сродкі, матэрыяльныя і нематэрыяльныя. Напрыклад, навучыць можа толькі вельмі добры мастак, перадаць свой досвед. А каб сапраўдны мастак пайшоў выкладаць, яму трэба заплаціць, бо ў першую чаргу ён хоча пісаць сам!.. Акадэмія Дзюсельдорфа запрашала самых лепшых з усяго свету. Іншая справа — наколькі табе і твайму таленту падыходзіць той ці іншы мастак-педагог… Увогуле, дасканаласці ў падрыхтоўцы ў акадэміях няма ні ў нас, ні на Захадзе. Але чым дакладна ў значна горшы бок адрозніваецца наша — усё як у арміі: ты павінен хадзіць па раскладзе, педагогі пішуць справаздачы, нехта вечна ўсім незадаволены… У нас у групе быў хлопец з Манголіі з унікальным талентам рабіць заданні імгненна. Дык ён зробіць заданне, і ідзе сабе, каб папрацаваць над тым, чаго яго душа патрабуе. І наколькі ён быў уражаны і абражаны, калі яму паказалі журнал з пропускамі: «Я ж усё зрабіў!..»

— А вы ж паходзіце з сям'і славутых мастакоў і педагогаў, то маглі яшчэ і параўноўваць…

— Канешне, у гэтым, мабыць, і быў асноўны канфлікт, што ўсе пра маіх родных ведалі, мне было ад каго атрымаць абсалютна прафесійную ацэнку. Здаралася, дома я чула: «Гэта вельмі добра, але не паказвай у Акадэміі, паставяць двойку». Не слухалася… Вось у Еўропе студэнтам даецца многа самастойнасці, хочаш дасягнуць поспеху — усё залежыць толькі ад цябе, можаш хоць зусім не вучыцца, проста паказваеш свае работы — і іх бяруць ці не бяруць. Гэта ж бізнес са сваімі законамі. У Дзюсельдорфе імкнуцца, каб мастак быў асаблівы, індывідуальны, і радуюцца, калі ты не як усе. У нас жа галоўнае — каб пропускаў не было... А яшчэ — як можна выкладаць, калі ты не любіш людзей, не любіш сваіх вучняў? Я пра гэта неаднойчы думала, калі сустракала ў калідоры педагогаў, якія ішлі на заняткі з такім выглядам, што ідуць забіваць, а не вучыць, не песціць талент і іскру Божую ў студэнтах.

— Нагадайце, за што вас выключылі? І ці быў момант, калі, дасягнуўшы поспеху, вы адчулі сябе «адпомшчанай»?

— Мне тады паставілі двойкі па ўсіх шасці спецыяльных прадметах. Пры тым, што з агульнаадукацыйнымі ўсё было ідэальна. Асабліва крыўдна, што я ж старалася, я шчыра і натхнёна працавала. Наконт поспеху — нават не ведаю, што гэта за поспех, нейкі вельмі ўмоўны, амаль не поспех. Я да сябе стаўлюся вельмі рэалістычна.

— Любіце займацца самаедствам?

— Люблю. Часам нават самазнішчэннем, замест таго, каб з галавой сысці ў працу. А мне трэба як піяністу трэніравацца кожны дзень. Хтосьці можа і паўгода нічога не рабіць, а потым прыйсці і нешта з галавы дастаць. Я ж павінна ўвесь час працаваць на хвалі натхнення, заўсёды быць на вастрыні творчага стану.

— Вы мелі дачыненне да цікавага праекта ў Варшаве — галерэі сучаснага мастацтва *ZOYA*, дзе ладзілі розныя выстаўкі.

— Зараз галерэі ўжо няма, хаця той перыяд быў вельмі цікавы. Галерыі такія: то з'яўляюцца, то знікаюць, шмат у чым поспех залежыць ад выпадку. Гаспадар выдатна разбіраўся ў мастацтве, але там павінна была быць падтрымка і вядомых польскіх мастакоў, чаго не здарылася: звычайная гісторыя — кожны сам за сябе. Гэта ж вельмі складаны занятак: адна справа прадаваць рэчы першай, жыццёвай неабходнасці, іншая — творы мастацтва, якія, па вялікім рахунку, мала каму патрэбныя. Можа, у Еўропе з гэтым і трохі прасцей, а ў нас я нярэдка бачу вялізныя багатыя дамы, ледзь не палацы — а на сценах ніводнай карціны, затое шпалеры — па тысячу долараў за метр. Я лічу, што гэта нават сорамна.

— Праз год у вас юбілей, звычайна мастакі рыхтуюць вялікія справаздачныя выстаўкі і розныя імпрэзы. Якія ў вас планы?

— Калі і былі нейкія планы адзначыць 50-годдзе, то зараз мне здаецца, што не варта так часта людзям пра сябе нагадваць, абцяжарваць іх сваёй персонай. А то і тут я, і там... Я проста вельмі радая такому выхаду з музеяў на вуліцу, гэта тое, чаго мне заўсёды хацелася, яшчэ са студэнцкіх часоў. Я нават абдумвала, як ладзіць выстаўкі ў двары дома, дзе мая майстэрня: каб карцінам неяк вольна дыхалася, каб іх мог паглядзець кожны, каб яны былі не для выбраных эстэтаў, а для ўсіх. Гэтая ідэя мяне моцна натхняе. Можа, падумаю ў гэтым кірунку.

Надзея КУДРЭЙКА

Казка Алены

Апошнія гады ў культурнай прасторы то тут, то там згадваюць Алену Кіш: яна вяртаецца ў наш свет праз элементы масавай культуры, праз акадэмічныя напрамкі даследаванняў, праз візуальную культуру, тэатр і літаратуру.

У культурнай прасторы ОК16 адбылася прэм'ера спектакля «Прымітывы» Аляксандра Марчанкі, па словах стваральніка, прысвечаны Алене Кіш. Але на самай справе ўсё крыху не так.

Спектакль пачынаецца ўжо тады, калі вы прыходзіце ў залу, сядаеце на сваё месца, падымаеце вочы на экран — і чытаеце развагі пра творчасць Алены Кіш ад сучасных даследчыкаў і дзеячаў мастацтва. Для стварэння спектакля рэжысёр аб'яднаў тры мастацкія даследаванні — і гэта першае. Другое даследаванне рэжысёра — работа з дзённікавымі запісамі Рыгора Гардзея, аднавяскоўца Алены Кіш. Трэцяе — відэаматэрыялы, па якіх можна паглядзець, што памятаюць пра мастачку тыя людзі, якія яшчэ заспелі яе жывой. Аляксандр Марчанка ўмее тонка апрацоўваць дакументальны матэрыял, а мастацкаму матэрыялу надаваць смак дакумента. Гэтую рысу можна называць індывідуальным стылем рэжысёра, які прасочваецца ва ўсіх яго спектаклях у той ці іншай ступені. Аляксандр Марчанка на падставе спектакляў стварае тэатральнае сацыялагічнае даследаванне, куды прыўносіць аспекты нашай штодзённасці — альбо ў візуальную частку спектакля, альбо ў яго тэхнічнае ўвасабленне.

Такім сацыялагічным даследаваннем стаў праект «Прымітывы» паводле п'есы Аляксея Андрэева.

Спектакль «Прымітывы» — гэта даследаванне стаўлення да Алены Кіш і яе творчасці, уяўленне пра якую практычна знікла з нашай культурнай прасторы і цяпер вяртаецца праз розныя сферы жыцця. «Прымітывы» — не пра Алену Кіш, якая так ні разу не з'яўляецца на сцэне, як і яе работы, а пра масавае ўспрыманне Алены Кіш. А ў масавым успрыманні яна адсутнічае, як і на сцэне, — вяртаецца толькі чужымі словамі. Так Алесь Малчанаў на сцэне быццам шукае мастачку ў скрынях стала, ведае пра яе, хоча знайсці — і сутаргава не знаходзіць. Мастачка прысутнічае ў спектаклі толькі праз дэталі яе пошуку — у сцэнаграфіі, у тэксце, у музыцы. Але не фізічна. То-бок «Прымітывы» — гэта спектакль не пра нашую аддаленую каштоўнасць, а пра нас.

Алена Кіш і яе лёс вытанчана прачытваецца ў сцэнаграфіі, створанай мастачкай Ганнай Балаш. На падлогу як палотны кладуцца светлавыя плямы, на якія транслюецца тэкст, а потым пад яго падстаўляецца белы стол — як палатно праектара. Я чытаю гэта як тыя самыя плоскасныя выявы наіўнага мастацтва, якія стварала Алена Кіш: даведкавы тэкст пра мастачку таксама ляжыць на тым палатне, куды яго нанеслі. І пасля на сталы-праектары, дзе запісана, хто гэтая гераіня, накідваюцца абрусы, якія перакрываюць усе літары, што робіць іх нябачнымі, як нябачным для нас на нейкі прамежак часу стаў лёс мастачкі. Яна жыла, яе творы існавалі і існуюць дагэтуль, зараз нават выстаўляюцца ў музеях, друкуюцца на хустках, становяцца цэнтрам літаратурнага твора (Зараслава Камінская «Русалкі клічуць»), але яе не відаць ва ўспрыманні тых, хто існуе па-за беларускай культурнай прасторай, якая — будзем шчырымі — ахоплівае не так шмат людзей.

«Прымітывы» пра хваравітае адчуванне адсутнасці, якое прачытваецца і ў відэаматэрыяле, над мантажом якога працавала Кацярына Чакатоўская. Спачатку глядач бачыць бясконцыя палотны тэксту пра тое, хто такая для нас (але першапачаткова — для іх, герояў апытанкі) Алена Кіш. У подпісах да гэтых тэкстаў — толькі род дзейнасці, ніякіх імёнаў. За гэтымі подпісамі асобы сціраюцца, змываюцца, абагульняюцца, ствараючы асабістыя вобразы, індывідуальнасць. Праз апытанку ствараецца адзіны вобраз зрэзу грамадства, якое кажа, што Алена Кіш важная для нас. А пасля мы глядзім відэазапісы інтэрв'ю з людзьмі, якія павінны нешта ведаць пра мастачку, але не ведаюць: яна недасяжная праз тых, хто мог ведаць яе асабіста. Даследаванне асобы мастачкі праз вусную гісторыю застаецца немагчымым. Перад запісамі мы чуем «сігнал GPS страчаны» — у іх таксама страчаная Алена Кіш: так, мы можам даехаць да таго месца, дзе яна жыла, працавала, але нешта ўжо немагчыма аднавіць, таму што яго не паспелі своечасова захаваць.

Спектакль выбудаваны на чаргаванні дзённікавых запісаў Рыгора Гардзея, які жыў у адной вёсцы з мастачкай, і відэаінтэрв'ю са сведкамі пра Алену Кіш. Чаргаванне дзённікавых запісаў і відэа — гэта чаргаванне эстэтыкі, чаргаванне часовых пластоў, чаргаванне сферы паўсядзённасці і сферы мастацтва, чаргаванне мастацтва і дакумента. Дзённікавыя запісы даюць зрэз таго часу і таго грамадства, у якім жыла Алена Кіш, — паказваюць кантраснасць перыяду: свет партыйных сходаў з пакланення перад Леніным і свет аўтара дзённіка, які вельмі дрэнна суадносіцца з савецкімі рэаліямі. Гэтая частка спектакля — гульня на кантрастах пад музычнае суправаджэнне Дзмітрыя Лук'янчыка.

Чаму пасля вайны Алена Кіш знікла з масавага ўспрымання? Тады распавядалі казкі, праз якія яе можна было зразумець: казка як ключык да магчымасці бачыць сэнс у тым, што яна рабіла. А зараз казак не распавядаюць. Як апошні акорд спектакля — кантрасная гульня з казкай, якая дае хваравітае пачуццё страты, якое трэба чымсьці запоўніць. Кропка напрыканцы спектакля — казка, расказаная са сцэны. Казка — як сімвал таго, што мы вяртаем сабе разуменне і вяртаем сабе Алену Кіш.

Святлана КУРГАНАВА

ВЫКЛІК БЕЗНАДЗЕЙНАСЦІ

Ляляўскі vs Пушкін: усе трагедыі вялікія



Жудасны век, жудасныя сэрцы… Так казаў Пушкін, і даўно тое было. Што змянілася? Няма рыцараў, але па зямлі ўсё так жа ходзяць сквапныя людзі, гатовыя ахвяраваць адносінамі з блізкімі дзеля ўласнай скарбонкі. Ёсць геніі і тыя, хто ім зайздросціць. Ёсць спакуснікі і тыя, хто гатовы спакушацца: чалавек жа слабы, недасканалы. Чалавек хоча адчуваць жыццё напоўніцу, калі яго фінансавы стан, здароўе, мараль дазваляюць «адарвацца», не звяртаючы ўвагі на тое, што навокал пануе бяда, — як даводзіцца часам чуць: «Адзін раз жывём». Можа быць…

З маленькага зла вырастае вялікае, нават калі падаецца, што тычыцца яно нейкага аднаго чалавека, які для агульнай карціны свету зусім нязначны. Няпраўда, лічыць рэжысёр Аляксей Ляляўскі, і спрачаецца з самім Аляксандрам Пушкіным, аўтарам «Маленькіх трагедый». Усе аргументы на сваю карысць пастаноўшчык спектакля «Пушкін. Вельмі маленькія трагедыі» ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек знаходзіць у тэксце класіка. Але ўжо па першай жа частцы «Скупы рыцар» — па тым, як вонкава пададзены герой і як прамаўляецца тэкст, — разумееш, што кожны «нязначны», нават смешны грашок, можа ператварацца ў вялікую трагедыю для іншых. Па значнасці тэмы гэты спектакль для мяне — адзін з самых яркіх у мінулым сезоне.

Аляксей Ляляўскі — той рэжысёр, які ўмее ўзняцца над тэмай і нават дробнае разгледзець на ўзроўні глабальнага. Не дзіва: зусім іншы век, а жудасныя сэрцы здольныя ўплываць на сусветныя маштабы.

Адпаведны канцэптуальны выбар рэжысёра, дзе акцэнт робіцца ў першую чаргу на чатырох жарсцях чалавечых (для гледача яны адмыслова пазначаныя пры пераходзе ад гісторыі да гісторыі), і пад іх жа прыдумана ўвасабленне герояў. Напрыклад, скупы рыцар — мілы і пухнаты хамячок, у якім грэх не пазнаць чалавека з пэўнай жарсцю. Ён падлашчваецца пад герцага — тут для метафарычнага абазначэння героя дастаткова (і сапраўды ж!) вялікай спагадлівай рукі. Моцарт — наогул непарушны бюст (нават некалькі, якія ў наш час дзе толькі не тыражуюцца), і што супраць яго маленькі лялечны Сальеры? Альбо як у «Каменным госці» выглядае маленькая лялька Дона Гуана супраць вялікай лялькі Доны Ганны — яна ў вачах іншых увасабляе прыстойнасць. А на «Балі падчас чумы» пануюць акцёры-людзі — гэта той час, калі хавацца бессэнсоўна, кожны сам за сябе, такі як ёсць. Такі, як пойдзе на найвышэйшы суд. Напэўна…

Для рэжысёра тут няма сумневу. Гэта зразумела і па рытміцы, у якой рушыць дзея ўсяго спектакля: спачатку повольная, а напрыканцы паскараецца. І ў гэтым ёсць логіка: час не той, што пры жыцці Пушкіна. Час паскараецца, спрасоўваецца, няма магчымасці рэпеціраваць жыццё і думаць, што ўсё можна будзе яшчэ паправіць. Значыць, з людзьмі трэба размаўляць больш канкрэтна. Нават жорстка.

І не так пяшчотна-павучальна, як няня з Сашам Пушкіным — але па факце пра тое ж. Гэтыя дыялогі ўстаўлены ў спектакль і яднаюць яго часткі, у тым ліку дазваляючы адчуць часавую адлегласць. Таму што самі гісторыі ў спектаклі распавядаюцца як прыпавесці. Нягледзячы на вонкавы гістарызм (паводле стыляў эпох), ёсць адчуванне нашага часу, які паўстае са сцэны: прыпавесці Ляляўскага разлічаны на яго гледачоў, а не на чытачоў Пушкіна пры жыцці аўтара. Наш час — у візуальным вырашэнні, дзе ёсць жаданне абысціся без лішняга антуражу. Ён у эстэтычным выяўленні (сцэнограф Тацяна Нерсісян), нават у выбары колераў: у сцэнічным змроку нібыта раствораны дух, які не трэба казаць словамі, яго адчуваеш, седзячы ў зале, і гэты дух імкнецца прарвацца са сцэны ў залу. Напрыканцы выходзіш з поўным адчуваннем, што сам жывеш у змроку, заціснуты ўмовамі і правіламі, не слухаеш свой дух, што, бывае, вярэдзіць сумленне і вядзе да неспакою. Але за гэтымі непрыемнымі адчуваннямі і дыскамфортам — дзейснасць, жаданне нешта зрабіць, змяніць.

Спектакль Ляляўскага не кажа ў лоб. Ён на тонкіх, дасціпных нюасах. Глядзіш за лялькамі ў «Каменным госці» — і разумееш, наколькі малы, нязначны чалавек, што напаўняе сваё жыццё жывёльнай жарсцю. Чалавек, які кідае выклік грамадству, нават Богу, наадварот, вялікі — і ва ўласных вачах, і ў вачах тых, хто гатовы маліцца на яго як на ўладара. Не, не лялькі галоўныя ў «Балі падчас чумы». Не хочуць быць сучасныя людзі лялькамі ў руках ці то сляпога лёсу, ці то сілы, якую адмаўляюць: дзяўчына ў балаклаве з'яўляецца прадстаўніцай нашага часу, але параджэннем мінулай эпохі, якая расплюшчыла чалавека цяжарам жудасных трагедый. Тут Пушкін гучыць не тое што ў маралізатарскім тоне, а нават апакаліптычна. Старшыня (варыянты імёнаў будуць з'яўляцца ў кожнага падчас прагляду ў залежнасці ад колькасці пражытых гадоў і ведаў найноўшай гісторыі) правіць баль, і навошта яму цяпер абцяжарваць сябе думкамі пра памерлых ад чумы маці ды жонкі? Ён гаспадар гэтага моманту. Магчыма…

Пакуль не гучыць апошні маналог, а разам з ім становяцца гучнейшыя і не паскараюцца ў рытме гукі. Нібыта набат адбівае тэрмін. Адбівае не яго — старшыні — імгненні. Гэтыя набатныя гукі ўжо пасля выхаду спектакля аддаюцца ў галаве, з пульсацыяй крыві пранікаюць у клеткі арганізма. Такім чынам рэжысёр умудраецца кінуць выклік трагічнай безнадзейнасці: верыць, што чалавек можа не загінуць, яго можна і трэба абудзіць і ўзняць. І гэта самы няпросты вынік спектакля, таму што невідавочны. Той вынік, які можа быць зусім недаспадобы тым, хто не катэгарычна прымае выклік, хто любіць піры і аддаецца жарсцям, для каго чужая маленькая трагедыя — не бяда. Але з маленькіх бед складаецца карціна татальнай трагедыі. Татальнай яе робіць у тым ліку абыякавасць ці не менш татальная прага забаў і бесклапотнага існавання (у тым ліку ў тэатры) без згадак, што чалавеку можа быць балюча.

У цяперашнім тэатры я бясспрэчна вітаю любую спробу неабыякавасці. Бо адседзеўшы ў татальнай цемры ўвесь спектакль, першае, што хочацца зрабіць — выйсці ў белы свет і глытнуць чыстага паветра, спадзеючыся, што яно будзе чыстым і святло — яркім.

Ларыса ЦІМОШЫК

у кадры і за кадрам

Вячаслаў НІКІФАРАЎ

Галоўныя асобы ў кінапейзажы

Уважлівы чытач здагадаўся, што змест гэтай калонкі грунтуецца пераважна на праблематыцы дзяржаўнага кіно. Настойваю, што ўсё, што здымаецца кінематаграфістамі на нашай зямлі пра нашых людзей, з'яўляецца беларускім кінематографам. І, тым не менш, лёс фільмаў, якія выпускаюцца «Беларусьфільмам» і датуюцца дзяржавай, заслугоўвае асаблівай увагі ад сцэнара да паказу. Папершае, таму, што добра структураванае кіраванне кінапрацэсам дазваляе аптымізаваць падыходы і сродкі для ажыццяўлення самых амбіцыйных намераў, першы з іх — стварэнне якаснага кінапрадукту. Па-другое, існуе гарантаванае фінансаванне. Па-трэцяе, ініцыяванне заканадаўчых актаў па ўдасканаленні як вытворчасці, так і пракату, а таксама магчымасці міжнароднага супрацоўніцтва пашыраюць перспектывы для айчыннага кіно.

Недзяржаўныя кампаніі і іх прадзюсары не валодаюць такім патэнцыялам. Яны ўсё жыццё служылі кінематографу (тэлебачанню, кінапракату) і сталі прадзюсарамі, рэалізаваўшы свае кінамары. І рызыкуюць яны ўжо тым, што, зняўшы хаця б адзін дрэнны фільм, могуць не разлічваць на фінансаванне наступнага. Адсюль — канцэнтрацыя волі і ведаў кінатэхналогій, памножаныя на адказнасць. Персанальную, што важна, — у сучаснай кіналексіцы «прадзюсарства» мае на ўвазе ў першую чаргу індывідуальную адказнасць.

Дзяржаўныя менеджары, а па-кіношнаму нават не дырэктары, але прадзюсары, існуюць у іншым рэжыме. Не скажу, што камфортным. Але далёкім ад неабходнай у такой справе засяроджанасці. Хоць бы таму, што яны знаходзяцца ў кантэксце дзясяткаў інструкцый, умоўнасцяў і ўплываў. І добра, калі каманда дасведчаная і добрасумленная, але ў дадзеным выпадку рэальнасць такая, што адрадзіць і ўмацаваць нацыянальны кінематограф выпала дэбютантам-энтузіястам, чый досвед запатрабуе часу, хто ведае — тры, пяць ці больш гадоў. І тут вырашальным стане асобасны фактар: што можна прыраўнаваць да акта творчасці, крэатыўнага самавыяўлення?

У нашым кінапейзажы — дзве галоўныя дзеючыя асобы: генеральны дырэктар кінастудыі і начальнік кінадэпартамента Міністэрства культуры. Трэба прызнаць, гэта два генеральныя прадзюсары беларускага кінематографа. Адважуся вызначыць для кожнага стратэгічны мінімум: сцэнар, яго фінансаванне, увасабленне ў фільм і пракат фільма. Калі персаніфікаваць: сцэнарыст і інвестар, рэжысёр і пракатчык. Далей мы можам выказаць здагадку, што гэтыя двое ведаюць, што трэба рабіць. Усім нам застаецца чакаць, не перашкаджаць, дапамагаць. Самае цяжкае, вядома, апошняе — паспрабуй дапамагчы, калі не просяць. Але грамадства мае права ведаць. Грамадства, яго інстытуты павінны скарыстацца гэтым правам, калі яму неабыякавы лёс «найважнейшага з мастацтваў». Пакуль жа мы бачым рэдкія інтэрв'ю, нясмелыя з боку журналістаў, якія, як правіла, значна далей ад сутнасці рэчаў, чым менеджар-пачатковец. Неабходныя круглыя сталы з удзелам прадстаўнікоў розных СМІ і аўтарытэтных спецыялістаў у галіне кіно. Трэба праводзіць конкурсы прафесій — некалі выдатна зарэкамендавала сябе такая форма вытворчага спаборніцтва. Павінна абнаўляцца кіназнаўчая дзейнасць, якая нясе важную інфармацыю аб глыбінных працэсах у кінакультуры, аб стане кінамыслення, кінамовы. Як вынік — навукова-вытворчыя канферэнцыі (вось актуальная тэма: як злучыць ідэйна-мастацкія памкненні Міністэрства культуры і пракату і пераадолець засілле нянашага кіно). Нарэшце, патрэбна публічная дзейнасць генеральных прадзюсараў, падобна творчым вечарам майстроў-кінематаграфістаў, так званыя майстар-класы кіраўнікоў. Без усяго пералічанага нельга казаць, што ў нас ёсць кінематограф. Без адкрытасці персаніфікаванага кінапрацэсу нам застанецца проста чакаць. Зрэшты, менавіта ў гэтым пасіўным стане мы як гледачы і знаходзімся. А начакаўшыся і нагледзеўшыся фільмаў як з Захаду, так і з Усходу, чарговы раз ускрыкнем: ды дзе ж наша кіно?..

АЎТАРА!..

Якіх сцэнарыяў чакае «Беларусьфільм»?

Айчыннае кіно імкнецца больш арыентавацца на беларускую аўдыторыю. Маштабны нацыянальны кінапраект «Купала», сітком «Ілюзіі», гістарычнае фэнтэзі «Авантуры Пранціша Вырвіча» і ваенная кінастужка «Лёс дыверсанта» — у гэтых праектах кінастудыі «Беларусьфільм» шмат хто бачыць магчымасць рэнесансу Нацыянальнай кінастудыі. А што далей? Што ў сцэнарным партфелі студыі? Пра гэта мы пагаварылі з яе галоўным рэдактарам Антонам Сідарэнкам.

— Вы ўжо больш чым год на пасадзе галоўнага рэдактара Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». З якімі сітуацыямі «чаканні — рэальнасць» сутыкнуліся за гэты час?

— Калі шчыра, ніякіх асаблівых сюрпрызаў не было. Упершыню парог Нацыянальнай кінастудыі я пераступіў у 1998 годзе, яшчэ студэнтам. Быў знаёмы з большасцю нашых кінематаграфістаў і многімі супрацоўнікамі кінастудыі, быў гатовы да гэтай працы.

— Калі пагадзіліся на гэтую працу, то, напэўна, мелі нейкі план уплыву на развіццё кінастудыі. Што ўжо атрымалася, а што — не?

— Галоўная задача — прыцягнуць на Нацыянальную кінастудыю новыя цікавыя імёны, тых, хто мае сучасны погляд на кінамастацтва. Заахвоціць тых, хто мае талент і жаданне пісаць сцэнарыі для кіно. Спадзяюся, задача зараз якраз у стадыі выканання.

Задача нумар два — зрабіць сюжэты і тэматыку фільмаў Нацыянальнай кінастудыі больш цікавымі для сучаснага гледача, у першую чаргу беларускага. Спадзяюся, тыя прэм'еры, якія студыя рыхтуе напрыканцы 2019 года, гэтай задачы адпавядаюць.

— Ці імкнецца маладое пакаленне аўтараў супрацоўнічаць з кінастудыяй «Беларусьфільм»?

— Спадзяюся, што так. Кіраўніцтва студыі заўсёды ідзе насустрач маладым. Галоўнае, каб іх была гатовая прыняць сама сістэма кінавытворчасці.

— Маладая беларуская рэжысёрка Юлія Шатун у адным з інтэрв'ю на пытанне пра тое, ці магчыма яе супрацоўніцтва з кінастудыяй «Беларусьфільм», адказала, што калі гаворка аб прадастаўленні творчай свабоды і тэхнічных магчымасцяў студыі, то яна не бачыць перашкод да супрацоўніцтва. Аднак самае галоўнае, на яе думку, — каб ніхто не абмяжоўваў на ўзроўні ідэй. Як лічыце, пры такім падыходзе ці магло б адбыцца гэта супрацоўніцтва?

— Мы добра знаёмы з Юляй і трымаем кантакт. Зараз яна вучыцца ў Маскве ў Школе новага кіно. Спадзяюся, што здымаць яна будзе на радзіме.

— Якія тэмы пераважаюць у сцэнарыях, што трапляюць да вас на стол? У чым праблема маладых аўтараў?

— Галоўная праблема — адсутнасць арыгінальных сюжэтаў. Аўтары спрабуюць рабіць копіі таго, што бачаць на экранах, — пераважна тэлевізійных. Таму прапануюць меладрамы ці крымінальныя сюжэты. Многія дэбютанты чамусьці ўпэўнены, што валодаюць талентам камедыёграфа. Камедыя, між тым, — вельмі складаны жанр. Шмат спроб напісаць сцэнарый гістарычнай стужкі, асабліва пра Вялікую Айчынную, партызанаў...

Зразумела, ваенная тэма — магістральная для нашай кінастудыі, але большасць прапаноў абсалютна другасныя і не вытрымліваюць канкурэнцыі на фоне залатога фонду беларускага кіно па кнігах Васіля Быкава, Алеся Адамовіча і іншых класікаў нацыянальнай літаратуры.

Яшчэ адна праблема — адсутнасць прафесіяналізму і разумення жанру. Апошняе хочацца якраз прывіць нашым патэнцыйным аўтарам. Нацыянальная кінастудыі павінна выпускаць больш якаснага жанравага кіно, якое запатрабавана гледачом. А для гэтага патрабуецца пэўны прафесіяналізм, валоданне прыёмамі менавіта кінадраматургіі. У нашай краіне шмат цікавых літаратараў, тэатральных драматургаў, але кінасцэнарый — асобны жанр: каб пісаць годныя сцэнарыі, аднаго таленту і цікавых ідэй мала — трэба, як кажуць, набіць руку.

Галоўнай крыніцай для айчыннага кіно можа з'яўляцца наша літаратура — экранізацыі твораў сучасных аўтараў маглі б стаць добрай сцэнарнай асновай. Таму раю тым, хто хоча стаць нашымі аўтарамі, звярнуць увагу на навінкі літаратуры.

Што датычыцца тэмы, якую шукаем, — сучасная Беларусь, яе жыццё, праблемы і сюжэты. Здаецца, вельмі проста, але пакуль годных, арыгінальных сюжэтаў вельмі мала. Большасць прапаноў на ўзроўні ідэі, а прафесійны драматург прапісвае менавіта сюжэт.

— А які жанр, на вашу думку, карыстаецца попытам у гледачоў?

— Нацыянальная кінастудыя павінна разлічваць найперш на айчыннага гледача. У беларускіх кінатэатрах побач з галівудскім і расійскім кіно павінна прысутнічаць беларускае. І попыт на сваё ў нашага гледача, несумненна, ёсць. Таму найбліжэйшыя прэм'еры — нацыянальны праект «Купала» і тэлевізійны міні-серыял па прыгодніцкай кнізе Людмілы Рублеўскай «Авантуры Пранціша Вырвіча» якраз і павінны задаволіць гэты інтарэс.

— Ці паступае дастатковая колькасць сцэнарыяў, каб было з чаго выбіраць?

— Добрых, якасных сцэнарыяў заўсёды не хапае. Гэта праблема не толькі «Беларусьфільма», а абсалютна ўсіх кінастудый і прадзюсараў свету.

— Ці бывае так, што нейкія сцэнарыі даводзіцца адразу адхіляць?

— Адхіляю відавочную графаманію ці тое, што немагчыма паставіць на нашай студыі, усё больш-менш годнае перадаю чытаць кіраўніцтву, калегам-рэдактарам, рэжысёрам, якім гэтыя сцэнарыі могуць быць цікавыя. Тое, што плануецца да пастаноўкі, выносіцца на мастацкую раду.

— Ці адсочвае гэтыя працэсы Міністэрства культуры?

— Стужкі ў нас здымаюцца па замове Міністэрства культуры. Мінкульт аб'яўляе адкрыты конкурс на фінансаванне кінавытворчасці па пэўнай тэме, а мы ўжо прапануем варыянты. Сталая ўмова конкурсу — у сцэнарыях не павінна быць нецэнзурнай лексікі, гвалту, алкаголю, наркотыкаў і г. д.

— З 27 мая да 31 жніўня ідзе прыём сцэнарыяў для ігравых фільмаў на конкурс «Мая Беларусь», які праводзіцца Міністэрствам культуры і Нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм». Што залежыць ад студыі ў гэтым конкурсе?

— Студыя толькі суарганізатар. Конкурс праводзіць менавіта Міністэрства культуры. Сцэнарыі прапануюць самі аўтары, а мы такім чынам спрабуем знайсці сярод іх тых, з кім будзем працаваць далей. Наогул, мэта ўсіх конкурсаў — адкрыць новыя імёны. Зімой мы правялі маладзёжны конкурс на сцэнарый поўнаметражнага анімацыйнага фільма. Паставіць фільм паводле сцэнарыя-пераможцы — наша найбліжэйшая мэта.

— Пра што фільм, хто аўтар і калі яго можна будзе ўбачыць?

— Перамог сцэнарый мінчаніна Сяргея Рагаткі «Песнь Сірын». Гэта сучасная казка пра двух хлопчыкаў, якія выпадкова трапляюць у свет старажытнаславянскіх багоў. Рэжысёр-аніматар Алена Турава плануе рабіць па ім стужку. Пакуль нельга назваць канкрэтныя тэрміны, на жаль.

— Можаце спрагназаваць, якой кінастудыя «Беларусьфільм» будзе праз пяць гадоў?

— Галоўны вынік працы любой кінастудыі — цікавыя і запатрабаваныя гледачом і на фестывалях стужкі. Спадзяюся, праз пяць гадоў «Беларусьфільм» будзе выпускаць толькі такое кіно.

— На вашу думку, што трэба рабіць для таго, каб айчыннае кіно глядзелі жыхары нашай краіны?

— Цікавасць да нацыянальнага кіно, па маіх назіраннях, у нашай краіне расце. Справа за аўтарамі, якія павінны прапанаваць гледачу свой арыгінальны і цікавы позірк на кінамастацтва.

Гутарыла Наталля ВАВІЛОНСКАЯ

Сяброўства вялікіх

Будынак, у якім жыў Станіслаў Манюшка (так званы «Дом масонаў»).

Станіслаў Манюшка — адзін з самых вядомых беларусаў на зямным шары, сусветна знакаміты кампазітар, класік беларускай і польскай вакальнай лірыкі. Манюшка вучыўся ў Берліне, працаваў у Пецярбургу і Варшаве, але ніколі не забываўся на радзіму, звяртаючыся да яе меласу, фальклору і сябруючы з найвыдатнейшымі землякамі свайго часу.

СТАНІСЛАЎ МАНЮШКА І СЯБРЫ ТАЙНЫХ ПАТРЫЯТЫЧНЫХ ТАВАРЫСТВАЎ

Пачатак XIX стагоддзя. У легендарным для Беларусі Віленскім універсітэце пачынаюць дзейнічаць тайныя патрыятычныя таварыствы філаматаў (аматараў ведаў) і філарэтаў (прыхільнікаў дабрачыннасці). Гісторыя наўрад ці памятае прыклады таго, як згуртаванне студэнтаў-сяброў фактычна вызначыла напрамак развіцця нацыянальнай культуры на стагоддзі наперад, але менавіта гэта і адбылося ў тыя далёкія часы. Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Тамаш Зан, Ігнат Дамейка, Аляксандр Ходзька, Антон Адынец, Францішак Маслеўскі, Юзаф Яжоўскі і іншыя — без гэтых асоб нельга нават уявіць, якімі б былі беларуская (і не толькі) літаратура, мастацтва і навука.

Амаль праз дваццаць гадоў, як лепшыя выхаванцы Віленскага ўніверсітэта апынуліся пад следствам і былі высланы; амаль праз дзесяць гадоў, як і сама навучальная ўстанова спыніла сваю дзейнасць па загадзе Мікалая I, у 1840 г., Станіслаў Манюшка ўладкоўваецца звычайным арганістам у касцёл Святых Янаў у Вільні. Для шляхціца (ды будучага сусветна знакамітага кампазітара) праца не вельмі прэстыжная, але то быў і незвычайны касцёл — ён уваходзіў у ансамбль былога Віленскага ўніверсітэта. Сімвалічная старонка біяграфіі Станіслава Манюшкі, бо менавіта ён стаў адным з прадаўжальнікаў ідэй патрыятычных таварыстваў. Віктар Скарабагатаў, адзін з выбітных беларускіх даследчыкаў кампазітара, ужо даўно зазначыў: «Калі знаёмішся з выданнямі вакальных твораў Манюшкі, што выходзілі пры яго жыцці, і перадусім з шасцю першымі выпускамі "Хатняга спеўніка" — сшыткамі, якія склаў ён сам, калі чытаеш артыкул у *"Tygodniku Petersburgskim"* ці перапіску кампазітара, усё больш і больш пераконваешся: менавіта Станіслаў Манюшка стаў найтрывалым спадкаемцам і прадаўжальнікам справы філаматаў на Беларусі ў сярэдзіне XIX стагоддзя».

Уплыў легендарных віленскіх студэнтаў на Станіслава Манюшку неаспрэчны. Чаго каштуе толькі «Гімн філарэтаў» на словы Антона Адынца: «…Стах, далі нам болей-болей, чарку пусцім мы па коле, Зан суровы, будзь здаровы, віват, Тамаш Зан! Славіць далей ёсць ахвота. Хто больш сціплы за Чачота? Дык па новай, будзь здаровы, віват Чачот Ян!» (у перакладзе з польскай У. Мархеля). Непарыўная сувязь з былымі філарэтамі і філаматамі ўскосна ці прама праходзіць праз усё жыццё кампазітара. Станіслаў Манюшка вельмі любіў творчасць Адама Міцкевіча і шанаваў яго як вялікага паэта, а з Тамашам Занам і ўвогуле быў асабіста знаёмы: яны былі суседзямі ў мінскім так званым «доме масонаў». Асаблівая гісторыя стасункаў кампазітара з Янам Чачотам: на яго вершы Станіслаў Манюшка напісаў больш за ўсё твораў. Скончыўшы Берлінскую пеўчую акадэмію і вярнуўшыся на радзіму, кампазітар вырашыў зрабіць фундаментальную рэч — стварыць зборнік краёвых песень. Так з'явілася пры жыцці класіка шэсць выпускаў «Хатняга спеўніка», куды ўвайшоў беларускі і польскі мелас. Вось як апісвае спеўнік Станіслаў Манюшка ў *«Tygodniku Petersburgskim»*: «Вершы я стараўся выбіраць з найлепшых нашых паэтаў, перакананы ў тым, што гэтыя паэтычныя творы найбольш выявілі ў сабе мясцовы характар і каларыт… Вось чаму мой спеўнік можа выклікаць да сябе нейкую цікавасць. Бо калі цудоўныя вершы, паяднаныя з цудоўнай музыкай, здольныя адкрыць сабе доступ да вуха і сэрца не вельмі музыкальнага, то нават слабейшая, менш удалая музыка пры выдатнай паэзіі здабудзе сабе паблажлівасць; а тое, што ў ёй нацыянальнае, краёвае, мясцовае, што як рэха нашых дзіцячых успамінаў, ніколі насельнікам зямлі, на якой яны нарадзіліся і ўзраслі, падабацца не перастане».

У першым жа «Хатнім спеўніку» Манюшка змясціў тры «сялянскія песенькі» Чачота — «Ах, далёка», «Што там за кветка» і «Ой, бярозка міла». У рэшце рэшт, Віктар Скарабагатаў у цыкле нарысаў «Зайгралі спадчынныя куранты» адзначае: «З тысячы тэкстаў "сялянскіх песенек", узноўленых Чачотам па-польску, Манюшка адабраў дваццаць адзін. Гэта — своеасаблівы дзённік кампазітара, яго музычны сшытак лірычных замалёвак беларускага вясковага побыту. Тут пададзены розныя бакі гэтага побыту — вяселле, жніво, вайна, сіроцтва і шмат што іншае. Героі песняў — не толькі людзі, але і беларуская прырода, адухоўленая і ачалавечаная».

Мемарыяльная дошка ў гонар Станіслава Манюшкі з'явілася сёлета ў мінскім кафедральным касцёле.

СТАНІСЛАЎ МАНЮШКА І УЛАДЗІСЛАЎ СЫРАКОМЛЯ

Станіслаў Манюшка і Уладзіслаў Сыракомля пазнаёміліся, як звычайна бывала ў пазамінулым стагоддзі, у салоне. У гасцях у яшчэ адной выбітнай беларускай асобы — гісторыка-этнографа і выдаўца Адама Кіркора. Вершы Уладзіслава Сыракомлі таксама трапілі ў «Хатні спеўнік» (цыкл песняў «Лірнік вясковы», «Паходная песня літвінаў» і інш.). Сяброўства і творчае супрацоўніцтва кампазітара і паэта працягвалася ўсё жыццё. Уладзіслаў Сыракомля нават стаў хросным бацькам аднаго з сыноў Манюшкі — Яна Бабтысты. Сыракомля цаніў і вельмі верыў у талент кампазітара. У 1849 г. ён упісаў верш у альбом свайго сябра, дзе былі наступныя радкі: «Не толькі тут веліч твая многа значыць, тут лёс усталёўвае планы, Бог даў табе творчасць, агонь даў спявачы, пяеш ты — на тое пасланы. Цябе шчыра любім і плёну ўсе зычым: Літве прысвяціў ты натхненне і стаў як Арфей інструментам музычным, змякчаючы скалы, каменне» (пераклад У. Мархеля).

У 1857 г. Манюшка перабіраецца ў Варшаву. Сыракомля дакладна разумее, што беларуская зямля страціла яшчэ аднаго вялікага сына і балюча перажывае пераезд сябра. Паэт піша ў лісце да Яна Хэнцінскага: «Вось у гэтую хвіліну наш Манюшка, дрыжучы, чакае прысуду вашай публікі. Баюся прадказаць, але Бог ведае, ці будзе даспадобы вашай публіцы, спешчанай італьянскай музыкаю, цяжкая, класічная і адначасова хвалюючая музыка. Знаўцы пахваляць, але ці прымуць шырокія колы? Манюшка належыць патомным — ён спакойны за суд сучасных і будучых знаўцаў, але яму трэба, каб яго адчулі, зразумелі, палюбілі. Гэта болей значыць, чым апладысменты. Варшава ў гэтую хвілю маецца вынесці прысуд, але хай памятае, што гэты прысуд будзе яшчэ перасуджаны Еўропаю і нашчадкамі. Суддзі, майце на ўвазе!»

Як паказвае гісторыя, шырокія варшаўскія колы прынялі Манюшку надзвычай добра, настолькі, што і зараз лічаць вялікім польскім кампазітарам. Што праўда, безумоўна, але найперш Манюшка быў беларусам, што і зазначыў яго сябар. Верагодна, Сыракомля як ніхто бачыў трагізм пераезду Манюшкі з радзімы, дзе вельмі часта творцу трэба даказваць сваю вартасць за мяжой, каб яго пачалі шанаваць і самі беларусы. Ён пісаў у 1860 г.: «Я разумею, што Варшава павінна мець свае церні, але і адчуваю, што ў ёй вальней дыхаць грудзям мастака. З часу, як ты нас пакінуў, ты даў столькі бліскучых сведчанняў мастацкага жыцця, што нам і гонар перад Еўропаю, і сорам за сябе, што знакамітага земляка мы раней не ўмелі цаніць».

СТАНІСЛАЎ МАНЮШКА І ВІНЦЭНТ ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ

Супрацоўніцтва гэтых двух творцаў падаравала нам оперу «Сялянка», дзе ўпершыню са сцэны прагучала беларуская мова, нацыянальныя мелодыі, прыказкі і прымаўкі, што было ў той час не проста смела, а амаль гераічна. Опера адразу была забаронена царскімі ўладамі, а ноты знішчаліся. На жаль, толькі два музычныя фрагменты захаваліся да нашых дзён. У цыкле нарысаў «Зайгралі спадчынныя куранты» Віктар Скарабагатаў адзначае і стаўленне Манюшкі да Дуніна-Марцінкевіча: «Што да Манюшкі, дык, калі ўспомнім "Вершы я браў з найлепшых нашых паэтаў", несумненна, ён залічыў туды Дуніна-Марцінкевіча», а потым даследчык дадае яшчэ адну важную думку ў разуменні светапогляду кампазітара і людзей яго часу: «Нельга не заўважыць, што ёсць вельмі прыкметны другі сэнс Манюшкавага слова "наш". У вуснах беларускай інтэлігенцыі XIX ст. гэтае слова мела даволі выразны краёва-патрыятычны беларускі (ліцвінскі) сэнс. Як тут не ўспомніць назоў зборніка літургічных спеваў таго ж Манюшкі — "Песні нашага касцёла" ці, напрыклад, пачатак ліста Сыракомлі да Хэнцінскага ў Варшаву: "Вось, у гэтую хвіліну наш Манюшка, дрыжучы, чакае прысуду вашай (польскай) публікі". І ў пазнейшы час гэтае слова азначала для беларусаў тое самае: газеты "Наша доля", "Наша ніва"».

Стваральнікам беларускай нацыянальнай класічнай оперы каля ратушы ў Мінску ўстаноўлены помнік. Станіслаў Манюшка і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч быццам замерлі ў натхнёным абмеркаванні «Сялянкі», нават не здагадваючыся, што будзе значыць іх твор для нашчадкаў.

Ганна ВАРОНКА

Пераможная серыя цымбальнага аркестра

«BIM» *(«Bydgoskie Impresje muzyczne»)* — гэта міжнародны конкурс-фестываль, які вось ужо на працягу 42 гадоў праходзіць у апошні тыдзень чэрвеня ў Быдгашчы (Польшча). Гэтым разам адміністрацыйны цэнтр Куяўска-Паморскага ваяводства сабраў больш чым 20 моладзевых інструментальных і харавых калектываў для ўдзелу ў «42-х Быдгашцкіх музычных уражаннях». Геаграфія краін-удзельніц шырокая: Польшча, Італія, Венгрыя, Галандыя, Румынія, Латвія, Грузія, Расія, Украіна, Турцыя, Кітай… Рэспубліку Беларусь прадстаўлялі два калектывы: народны аркестр беларускіх народных інструментаў «Бравэрка» Лідскага дзяржаўнага музычнага каледжа пад кіраўніцтвам Галіны Пушкінай і аркестр беларускіх народных інструментаў «Кропелькі» пад кіраўніцтвам Дар'і Фраловай (г. Мінск).

Насычаная праграма фестывалю ўключала не толькі конкурсныя праслухоўванні ўдзельнікаў кампетэнтным журы, але і парад аркестраў на цырымоніі адкрыцця, канцэртныя выступленні на адкрытых пляцоўках горада, нефармальныя сустрэчы маладых выканаўцаў у цёплай сяброўскай атмасферы ў культурна-забаўляльным цэнтры, калегіум дырыжораў калектываў на сустрэчы ў мэрыі Быдгашча і заключнае выступленне на гала-канцэрце на закрыцці конкурсу і цырымоніі ўзнагароджання.

Цымбальны аркестр «Бравэрка» Лідскага дзяржаўнага музычнага каледжа пад кіраўніцтвам Галіны Пушкінай падрыхтаваў на конкурс у Быдгашчы рознастылёвую праграму, якая ахоплівае музыку сучасных беларускіх кампазітараў («Жалейка» В. Кузняцова і «Бывайце здаровы» А. Крамко), а таксама творы заходнееўрапейскіх кампазітараў у аўтарскай аранжыроўцы (фуга-містэрыя А. П'яцолы, інтэрмедыя з сарсуэлы «Вяселле Луіса Алонса» Х. Хіменеса і паланэз В. Кілара з мастацкага фільма «Пан Тадэвуш»).

Паспяховае выступленне і папярэдняя плённая праца прывялі калектыў у выніку да заслужанай узнагароды найвышэйшай вартасці — спецыяльнага дыплома міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Польшчы, які ўручаецца толькі пераможцам. Прыемна, што пераможнае шэсце па Еўропе аркестра беларускіх народных інструментаў з Ліды (літаральна ў маі гэтага года цымбальны аркестр здабыў Гран-пры з бельгійскага Неерпельта) шмат у чым стала магчымым дзякуючы Гранту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які калектыў атрымаў у пачатку 2019-га на развіццё конкурсна-фестывальнага руху і прапаганды нацыянальнай музычнай культуры за межамі нашай краіны.

Алена БАТУРА

Скарбонка Спадчыны

Чый каравай вышэйшы, той у хаце галоўны,

прыкмячалі палешукі падчас адмысловага вясельнага дзейства

Каравай — гэта не проста хлеб, а знак дабрабыту, абавязковы атрыбут многіх абрадаў і свят. На Палессі караваю здаўна прыпісвалі магічныя функцыі: ён бярог ад бяды ў дарозе, бараніў дом ад пажару. Асабліва яго магічныя сілы ўзмацняліся падчас вяселля, калі для маладых наступаў пераломны, таму і небяспечны момант у жыцці. Традыцыйна ў Беларусі пасля Пятроўскага посту, які заканчваўся 11 ліпеня, пачыналі праводзіць вяселлі.

Галоўным сакральным атрыбутам выступаў каравай. Амаль тры гады таму вясельная каравайная традыцыя аграгарадка Моталь Іванаўскага раёна была занесена ў дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. Убачыць гэты ўнікальны абрад і паўдзельнічаць у ім можна сёння ў Мотальскім музеі народнай творчасці.

— Абрад «Вясельны каравай» — гэта звычай выпечкі, упрыгажэння і міжродавага раздзелу абрадавага хлеба — караваю, — распавяла дырэктар музея Вольга Кульбеда. — Выпякаюцца два караваі: адзін — у доме жаніха, другі — у нявесты. Адметнасцю з'яўляюцца гузы ці шышкі — ачышчаныя галінкі садовых дрэў з пэўнай колькасцю разгалінаванняў. У караваі нявесты павінна абавязкова быць тры шышкі з двума парасткамі і дзве шышкі з трыма парасткамі. А ў караваі жаніха — чатыры шышкі з двума парасткамі і адна — з трыма. Затым шышкі абкручваюцца доўгімі палоскамі цеста і запякаюцца над полымем у печы. Далей іх, упрыгожаных барвінкам, аўсом і папяровымі кветкамі, утыкалі ў каравай і змацоўвалі чырвонай стужкай, якую варта было захоўваць і пасля вяселля, бо яна, паводле павер'я, набывала гаючыя ўласцівасці. Займаюцца гэтым спецыяльна запрошаныя жанчыны — каравайніцы, старэйшая над якімі — хросная маці. Лічыцца, што выбар каравайніцы можа паўплываць на лёс маладых. Таму запрашаюць толькі самых паважаных і гаспадарлівых жанчын.

Рэцэпт каравая немудрагелісты: мука, малако, алей, цукар, дрожджы, яйкі, ванілін, гарэлка, соль. Частка цеста ідзе непасрэдна на булку, астатняя — на ўпрыгожванне і шышкі.

…Жаніх прыязджае да нявесты з караваем. А пасля вянчання сваты пад музычны акампанемент уносяць яго ў святочную залу. Пры гэтым важна несці каравай максімальна высока. Чый знаходзіцца вышэй, той і будзе ў сям'і галоўны.

Мотальскі абрад «Вясельны каравай» ад пачатку да канца суправаджаецца малітвамі, дабраславеннямі, адмысловымі абрадавымі песнямі. Гэтыя песні ўнікальныя, бо пазбеглі ўплыву суседніх культур і сёння, як і ў старадаўнія часы, маюць адзін напеў і адметную манеру выканання і надаюць каравайнаму абраду своеасаблівы каларыт, эмацыянальную сілу. Песні выступаюць разам з караваем магутным абярэгам усяго дзейства.

— Першы дзень вяселля выпадаў, як правіла, на суботу, — заўважае Вольга Кульбеда. — На другі дзень вяселля, у нядзелю, адбываўся падзел каравая. Кожны атрымліваў сваю долю ўзамен на падарунак і добрыя пажаданні маладым. Шышкі падчас вяселля таксама раздаюцца гасцям: першая з кавалкам каравая аддаецца маладым, другая — бацькам, а апошняя — музыкам. Гэтыя шышкі таксама набываюць магічную сілу.

Дарэчы, Мотальскаму музею народнай творчасці аднаму з першых у 2001 годзе была ўручана спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва за шматгранную працу па прапагандзе і папулярызацыі народнага мастацтва і традыцыйных промыслаў.

Раіса МАРЧУК

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Тацяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк 11.07.2019 у 11.00

Ум. друк. арк. 3,72

Наклад — 1066

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 2251

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.